№ 15 (325) 18 красавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднoўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Вялікдзень



**Што важнейшае за мір**
Павал Севярынец у рубрыцы "Правым вокам".
старонка 2

**Дабравольскі ня хоча стаць прэзыдэнтам**
Пэрспэктывы выбараў-2006.
старонка 4

**Пераход на лацінку непазьбежны,**
тэлекамэнтатары загавораць на дыялектах... Швэдзкі досьвед Андрэя Катлярчука.
старонка 12

# Маем рэч

**У аўторак у менскіх кнігарнях зьявілася кніга «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя». Гістарычнага выданьня такой якасьці ў Беларусі яшчэ не было. На 320 старонках зьмешчаны блізу 2000 ілюстрацыяў. Узяў у рукі — маеш рэч.**
**Выданьне ўпрыгожваюць летапісныя мініятуры, сярэднявечныя гравюры, рэдкія фатаздымкі, частка якіх дагэтуль была невядомая нават беларускім гісторыкам. Зьмешчаныя ў кнізе выявы — толькі пятая частка таго масіву, зь якога рабіў выбарку мастак. На іх пошук і падбор пайшло амаль два гады. Кнігу стварылі пісьменьнік Уладзімер Арлоў ды мастак Зьміцер Герасімовіч (на здымку).**

**Працяг на старонцы 11.**




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Велікоднае пасланьне айца Аляксандра Надсана

## Няхай тое ў вас думаецца, што ў Хрысьце Ісусе (Філ. 2:5)

Адной з найбольш урачыстых сцэнаў у Эвангельлі ёсьць, без сумневу, уваход Хрыста ў Ерусалім. Адчуваецца сьвяточны настрой, атмасфэра радаснага чаканьня нечага новага і вялікага: натоўп, што выйшаў насустрач Хрысту, вітаў Яго воклікамі «Гасанна! Блаславёны той, хто прыходзіць у імя Госпада». Сярод гэтай радаснай мітусьні адзін Хрыстос застаецца спакойны, засяроджаны: магчыма, Ён думаў, колькі з гэтых людзей, якія яго так радасна сустракаюць, будуць праз пяць дзён на іншым месцы крычаць: «Укрыжуй Яго!»



Ён ня меў ніякіх ілюзіяў адносна вартасьці людзкой славы, бо ведаў, як спрытны дэмагог можа пакіраваць настроем натоўпу ў патрэбным яму кірунку, а пасьля казаць, што выконвае «волю народу».

Тыя, што падбухторылі народ дамагацца Ягонай сьмерці, уважалі сябе духоўнымі правадырамі народу. Гэта былі ўсе «прыстойныя» людзі, пабожныя, якія строга выконвалі ўсе патрабаваньні закону. Ім было незразумела, як Той, каго яны чакалі як Збаўцу, «еў з мытнікамі і грэшнікамі», а ім казаў: «Гора вам, кніжнікі і фарысэі, крывадушнікі, што даяце дзесяціну зь мяты, кропу і кмену, а забыліся пра найважнейшае ў законе: справядлівасьць, міласэрнасьць і веру» (Мц 23:23). Так самаўпэўненасьць у сваёй праведнасьці прывяла да забойства Праведнага.

У сваіх намаганьнях зьнішчыць Хрыста духоўныя правадыры знайшлі супольную мову са сьвецкімі ўладамі. Іхні «саюз» быў замацаваны магілаю Хрыста, на якой адны паставілі свае пячаткі, а другія прыставілі варту да яе.

Але і адны, і другія памыліліся. Яны разважалі па-зямному. А Валадарства Хрыстова было «не ад гэтага сьвету» (Ян 18:36), і таму змаганьне за яго вялося не з дапамогай зямной зброі. Яно мела месца на Крыжы, калі Хрыстос, які вісеў на ім, здавалася б, у хвіліну сваёй найбольшай паразы, выйшаў пераможцам, споўніўшы волю свайго Айца Нябеснага. Гэтая Ягоная перамога зьяўляецца быццам новым актам тварэньня, узнаўленьнем усяго сусьвету ў Богу і асновай нашай надзеі жыцьця вечнага зь Ім.

«Хадзеце да мяне, усе прыгнобленыя і спрацаваныя, і я супакою Вас» (Мц 11:28). Гэтыя словы Хрыста павінны быць для нас усіх асноваю нашай непахіснай надзеі. Хрыстос сваёй перамогай на Крыжы адчыніў нам дарогу да Божага ўсынаўленьня. Ён нікога не адкідае, у ягоным сэрцы ёсьць месца для ўсіх. Аднак Ён таксама не прымушае нікога сілаю, але хоча, каб мы самі прыйшлі да Яго на кліч нашых сэрцаў. Гэта варта памятаць усім нам, асабліва духоўным правадырам, каб не паддацца спакусе шукаць падтрымкі з боку, у сьвецкіх уладаў, за кошт іншых. Трэба спадзявацца, што часы, калі «айцы дубінай заганялі нас у рай», як казаў Якуб Колас, ужо мінулі. У нас павінны быць тыя самыя пачуцьці, што і ў Госпадзе Ісусе Хрысьце. Нашыя рэлігійныя перакананьні не павінны перашкаджаць шанаваць і старацца зразумець іншых, бо іхнія перакананьні ёсьць такія дарагія для іх, як нашыя для нас. Таму мы ня маем права зьняважаць іх, нават калі мы зь імі не пагаджаемся. А Хрыстос, які памёр за нас усіх і ўваскрос, каб нам даць дарогу да Божага ўсынаўленьня, залечыць нашыя раны і зробіць у свaім часе, каб была «адна аўчарня і адзін пастыр» (Ян 10:16).

**а.Аляксандар Надсан,**
**апостальскі візытатар для беларусаў замежжа, Лёндан**

**Наша Ніва**

Нагадваем, што падпіскаю «Наша Ніва» таньнейшая. Падпісны індэкс **63125**. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».



Дык падпісвайся!

## Беларусь перарасла Лукашэнку

Лукашэнкаў ідэал дзяржаўнага ўладкаваньня ў прынцыпе дасягнуты. Гэта значыць, што краіна ўжо даўно такая, якой бачылася кіраўніку ў 1994-м. І каб дзяржава разьвівалася, патрэбны ўжо іншы падыход і стыль кіраваньня. Аб'ектыўна насьпела патрэба ставіць новыя мэты і маляваць новыя далягляды. Сёлетняе пасланьне нацыянальнаму сходу пацьвярджае гэта. Беларусь перарасла Лукашэнку.

**Сяргей Дубавец**

### ЗША ня ставяць крыж

Сьледам за Эўразьвязам ЗША зьнялі візавыя абмежаваньні для найвышэйшага беларускага кіраўніцтва. Афіцыйная падстава — вяртаньне ў Беларусь місіі АБСЭ. Фактычна ж гэта крок у адказ на пакуль нязначныя перамены ў Беларусі.

**МБ**

## Баляда Іраку

Мы з табой прыдумалі Ірак,
Не краіну — дробненькі бардак.
Ну а потым, выпіўшы партвэйну,
Мы сабе прыдумалі Хусэйна,
І яго вусатыя партрэты
Упрыгожылі нам туалеты.
А на пляцах бюсты, манумэнты,
Як Хусэйна слаўныя мамэнты,
Не даюць прайсьціся без паклону,
Бо зьняць галаву, нібы карону,
Могуць за няўвагу да Хусэйна...
Можаш не вярнуцца ты з басэйну...
Плаваць у салянай кіслаце —
Не сядзець варонай на кусьце
І чакаць штодня, нібыта сыру,
То вайны з Амэрыкай, то міру.
І здавалася, што гэтак будзе
Вечна, бо інакш ня хочуць людзі
Жыць у нашым мройлівым Іраку.
Ды далі ракетаю пад сраку
Злыя дзядзькі добраму Хусэйну,
Ды і нам, каб не пілі партвэйну.

**ВШ**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Рытуальныя суды

Пракуратура адну за адной разгортвае гучныя крымінальныя справы. Стала вядома, што ўжо месяц як арыштаваны былы кіраўнік «Белпрамбудбанку» Мікалай Ракаў. Праз пару дзён распачнецца працэс гендырэктара МТЗ Міхаіла Лявонава.

Садзяць, садзяць, а людзі ўсё крадуць, крадуць. Раней гэта сьпісвалі на наступствы пераходнага пэрыяду, калі законы і ўлада не ўмацаваліся, а бізнэсоўцы ўжо назапашвалі капіталы. Аднак тыя гады мінулі, а адказныя асобы, зацьверджаныя асабіста кіраўніком дзяржавы, бясконцай чарадой ідуць у турэмныя спраты. Такога цяпер няма ні ў Польшчы, ні ў Літве, хоць тамака капіталы абарочваюцца большыя.

Гучныя працэсы — ня столькі праява эфэктыўнасьці барацьбы з злачыннасьцю, колькі рытуал, з дапамогай якога ў грамадзтве падтрымліваецца атмасфэра страху. Раз такі мэханізм існуе, значыць, ён камусьці выгадны. Толькі яўна не дзяржаве і не яе запалоханым грамадзянам.

**Андрэй Дынько**

НЕЎЗАБАВЕ Ў «НН»

## Кніга летніх дарог

У траўні «Наша Ніва» пачынае публікацыю запісаў Рыгора Барадуліна «З запазухі». У летніх вандроўках заставайцеся з «Нашай Нівай».

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Мода на пацыфізм



У суботу ўзяў піва і пайшоў да бэрлінскай сядзібы Хрысьціянска-дэмакратычнага саюзу, дзе пацыфісты ладзілі свой тусач. Ішоў на акцыю як на сустрэчу з старымі карашамі. Думаў пабачыць усіх ганаровых сяброў бэрлінскага левага клюбу: саўкоў з ПДС — партыі нашчадкаў Хонэкера, фанатыкаў двух варожых трацкісцкіх ордэнаў, якія не падзялілі тэарэтычнай спадчыны Лява Давідавіча, курдзкіх маіістаў з бубнамі, багатых левых інтэлектуалаў і, нарэшце, гуртох агрэсіўных панкаў з сабакамі-вэгетарыянцамі.

Дабраўшыся да месца збору, заўважыў, што ў нашай пясочніцы зьявіліся новыя твары. Тынэйджэры. Мора падлеткаў. Гэта была нейкая новая левая шыза, якой я яшчэ ніколі ня бачыў.

Адна з удзельніц дэма трымае плякат: «Бамбіць дзеля міру — тое самае, што трахацца дзеля самотнасьці». Палітызаваную Лаліту завуць Ганна, ёй 14 гадоў. Кажа, што ўзначальвае школьны камітэт супраць вайны, які сёньня дзейнічае пры кожнай школе. Колькі іх? Толькі ў Бэрліне каля 70000 чалавек. Чаго жадае — каб не было вайны. Вайна — гэта дрэнна. Капіталізм — гэта дрэнна. Сацыялізм — гут.

З размовы так і не дапёр, чаго патрабуе Ганна: мікс паміж Талстоем і Карлам Марксам.

Але хіба гэта галоўнае? Галоўнае, што быць сёньня на Захадзе пацыфістам — гэта крута. Крута насіць майку з Чэ Геварам і значкам Гандзі, нягледзячы на тое што ў свой час кангрэс Камінтэрну засудзіў Гандзі як дробнабуржуазнага халуя. Крута хадзіць на пацыфісцкія дэма і байкатаваць «Макдональдзы». А хто так ня робіць, той адстойны лох, у якога відавочна будуць праблемы з пошукам сэксуальнага партнэра.

Такія ж «наіўныя палаючыя вочы», як у Ганны, апошнім разам я бачыў у 1997-м на сядзібе МФ. Севярынец марыў стварыць з падлеткаў моладзевую субкультуру.

У Бэрліне я бачыў мару Севярынца: 20000 тынэйджэраў бегалі, як па Тыргартэне, равучы «Не вайне!», «Сьвету мір!», «Хай будзе сонца!». Крутое відовішча!

Нават калі Буш будзе кожны тыдзень скідаць пааднаму дыктатару, гэта не пераканае Ганну і яе сяброў кінуць бегаць на дэманстрацыі. Гэта кшталту прынцыпу самаідэнтыфікацыі. За апошнія паўгоду на Захадзе нарадзілася новая моладзевая субкультура — пацыфісты. Яна мае структуры, матэрыяльныя магчымасьці (майка «No war» каштуе 20 эўра, калі бярэш тры — чацьвертая бясплатна) і падлеткавы кураж, каб дамінаваць на глябальным рынку моладзевай моды. Яна дасьць наступную генэрацыю палітычных актывістаў, у тым ліку і ў Беларусі.

Вельмі важным днём для фармаваньня мітаў новай субкультуры стане 1 траўня, калі больш шасьць гэтых тынэйджэраў першы раз у сваім жыцьці выйдуць на Першамай. Першамай на Захадзе — дзень рытуалізаванай агрэсіі супраць паліцыі. Прыкольна было б даведацца, што скажа Ганна пра праблемы міру і вайны, запусьціўшы «кактэйль Молатава» ў паліцэйскі браневічок.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Важнейшае за мір



Моладзь мусіць змагацца. Яе роля і прызначэньне ў любым грамадзтве, у любыя часы — у катэгарычнай і бязьлітаснай барацьбе з тым, што творыцца навокал.

Скажаце, што такога творыцца? Ну як: вайна ў Іраку, уціск правоў, расізм, сэксізм, засільле Галівуду… Вы што, TV не глядзіце — навокал адна глябалізацыя! І маладыя людзі ў банданах, зь вясёлкавымі сьцягамі «Peace», з выявамі Чэ Гевары замест абразоў і лёгкай марыхуанавай смугой у вачах абсалютна пераканаўныя, што шпурляюць гэны памідор у твар найвялікшаму злу ў сьвеце.

І перамога ўсё бліжэйшая, і карцінкі тэлевізіі штодня ўсё больш кідкія, і вось дзесьці легалізавалі наркотыкі, а дзесьці — ура! — дазволілі аднаполыя шлюбы, і вось ужо 90% суайчыньнікаў выступаюць супраць вайсковае апэрацыі ў Іраку — але раптам выяўляецца, што сяброўка — фанатка «Тату» чамусьці зрабіла аборт, сябрук-анархіст нечакана памёр ад перадазіроўкі, а ў роднай краіне не засталося каму выйсьці на плошчу пад бел-чырвона-белым сьцягам.

Моладзь бездапаможна аглядаецца, шукае прычыны няшчасьцяў у асобах Біла Гейтса, Дональда Рамсфэльда й Джорджа Буша і баіцца сабе прызнацца, што, напэўна, гэта ўсё ж не яны. Неяк нямодна й няёмка змагацца за цьвярозасьць, цнатлівасьць, моцную сям'ю. Але рана ці позна больш шасьць пачынае шкадаваць, што сваю маладосьць аддала змаганьню за нешта іншае.

Пакуль гэта лёгка і ў кайф — запусьціць бляшанку з-пад кока-колы ў вітрыну «Макдональдзу» і зараўці што ёсьць моцы: «No war!!!» (што ў перакладзе на беларускую азначае «Абы вайны не было»). Ды ёсьць рэчы, важнейшыя за мір. Незалежнасьць, дэмакратыя, свабода. Беларускае новае пакаленьне вядзе сваю вайну — за краіну, за мову, за праўду.

Зрэшты, для самых крутых маладзёнаў ёсьць вораг, мацнейшы за Лукашэнку ці Пуціна. Вораг №1. Ты сам. Вайна з уласнай абыякавасьцю, нянавісьцю й спакусамі — той яшчэ action, павер. Трэба толькі прыняць выклік, каб пераканацца. На сёньня я ведаю адзінага Ваяра, здольнага прывесьці да перамогі ў гэтай вайне, — Ісуса Хрыста. Таго самага, які сказаў: «Ня мір прыйшоў Я прынесьці, а меч» (Мацьвея, 10:34).

Таму — змагайся, пакуль малады. Жыцьцё таго вартае.

**Павал Севярынец**

# Асуджаныя на адставаньне



Прапаганда ўбіла нам у галовы купу савецкіх мітаў. Прыкладам, беларусы і сёньня вераць, што краіна — высокаадукаваная.

Між тым, калі рабіць разьлік на ўсё насельніцтва краіны, дык ВНУ скончылі толькі 11,28% грамадзянаў. А ўрад моладзь па навуку на Захад не пасылае. Наадварот: выцiскае сваёй палітыкай адмысловцаў за мяжу і зьніжае працэнт адукаваных у краіне.

Гэта пра колькасныя паказьнікі. Цяпер наконт якасных. У лютым 1929 г. адзін функцыянэр паведаміў XII зьезду КП(б)Б, што 66% настаўнікаў ня маюць пэдагагічнае адукацыі. А 5 жніўня 1932 г. была апублікаваная пастанова СНК БССР аб увядзеньні ўсеагульнага 7-гадовага навучаньня. Ня думайце, што за тры гады зь неба ўпалі высокакваліфікаваныя пэдагогі. Усё прасцей: сьвету дэманстравалі «заваёвы» «дыктатуры пралетарыяту».

Яшчэ ў 1955 г. мяне ў 1-й клясе вучыла настаўніца зь сямігодкай за плячыма, а ў 1958 г. была ўведзеная ўсеагульная васьмігадовая адукацыя. Праз дзесяць гадоў абавязковай стала адукацыя сярэдняя. Перад школай і ня ставілася задача даваць вучням веды, патрэбныя для навучаньня ў ВНУ. Задача была прасьцейшая: даць усім школьнікам атэстат і арыентаваць іх на «рабочыя прафэсіі», хоць самі чыноўнікі цынічна прызнаваліся, што ўзровень тэхналёгіяў у СССР не патрабуе такой колькасьці работнікаў з атэстатамі.

Вынікам валюнтарысцкага падыходу да праблемаў адукацыі і бальшавіцкае паказухі сталася масавая квазіпісьменнасьць: у чалавека атэстат, а веды — на сем клясаў. А незапатрабаваныя веды ня толькі не ўзнаўляюцца, але й губляюцца. Таму ня дзіва, што дзядзькі і цёткі з 10-цю клясамі ня могуць разьвязаць простае задачкі й пішуць з процьмаю памылак.

У СССР добра выкладалі навукі, патрэбныя вайскова-прамысловаму комплексу, а гуманітарную і грамадзянскую адукацыю замяніла прапаганда. Адсюль яшчэ адзін вынік: у нас ня кожны чалавек з вышэйшай адукацыяй ведае свае правы і кампэтэнцыю паасобных дзяржаўных органаў. Дык што ж дзівіцца, што гэтага ня ведаюць людзі зь сярэдняй ці сямігадовай адукацыяй? А ўжо такія «складаныя рэчы», як падзел уладаў, палітычныя ідэалёгіі, выбарчыя сыстэмы...

Электарат Лукашэнкі складаецца не зь непісьменных, а з квазіпісьменных людзей: як правіла, усе 65-гадовыя і ў горадзе, і ў вёсцы скончылі савецкія сямігодкі, але ня кожны зь іх здолее прачытаць газэту і выкласьці сэнс прачытанага.

У вёсках выпускнікоў ВНУ значна менш, чым у гарадох (4,97% супраць 14,08%). А з гарадоў найбольшая канцэнтрацыя іх у сталіцы. Ні бальшавікі, ні іх наступнікі ня здольныя вырашыць сацыяльныя і культурныя праблемы вёскі. Сваё бясьсільле нэабальшавікі даводзяць тым, што ўводзяць асобны конкурс для абітурыентаў зь вёскі. Але ці падвысіцца ад гэтага якасьць вышэйшае адукацыі? Яна й так падае.

**Анатоль Сідарэвіч**

### Алімпіяду выйграла маладафронтаўка

**Пераможцай нацыянальнай алімпіяды па беларускай мове стала 17-гадовая Ірына Мураўёва,** вучаніца 11 «В» клясы Мастоўскай школы. Найлепшая ў краіне знаўца роднай мовы — актывістка незарэгістраванага «Маладога фронту». «НН» далучаецца да віншаваньняў.

### Паломніцтва афрыканскіх міністраў абароны ў Менск

**Менск чарговы раз наведаў міністар абароны Альжыру Махамед Лямары.** Мінулы раз ён прыяжджаў у 2001 г., і справа скончылася пастаўкай буйной партыі беларускай зброі. Афіцыйная мэта чарговага візыту — «абмен досьведам рэфармаваньня армій». Лямары прыехаў 14 красавіка, а 13-га горад пакінуў міністар абароны Кот-д'Івуару Асоа Аду.

### Улады зьбіраюць Кангрэс беларусаў сьвету

**«Супрацоўніцтва з дыяспарай мусіць спрыяць эканамічнаму разьвіцьцю краіны»,** — лічыць намесьнік старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Уладзімер Ламека. За год мае быць распрацаваная канцэпцыя эканамічнага супрацоўніцтва з дыяспарай. У 2005 г. на яе аснове ў Менску адбудзецца Кангрэс беларусаў сьвету.

# Папа наведае Татарстан?



**У жніўні Папа па дарозе ў Манголію можа спыніцца ў расейскай Казані, куды мае прывезьці з Ватыкану цудатворны абраз Казанскае Божае Маці. У курыі Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі «НН» паведамілі, што Ян Павал II — «найхутчэй» — ізноў абміне Беларусь.**

### Абрамчука папярэдзілі

**Пракуратура дала афіцыйнае папярэджаньне кіраўніку адміністрацыі Маскоўскага раёну Берасьця Валянціну Абрамчуку.** Падчас выбараў ён загадаў кіраўнікам прадпрыемстваў арганізаваць датэрміновае галасаваньне — нават у працоўны час. За апошняе і атрымаў папярэджаньне. Крымінальную справу па факце парушэньня Канстытуцыі пракуратура распачынаць адмовілася.

### Дзіўнае абрабаваньне

**У Баранавічах абабралі офіс грамадзкага аб'яднаньня «Варута».** Скралі з усіх кампутараў «вінчэстэры» з інфармацыяй, нічога больш. Пікантна, што ў адным будынку з офісам «Варуты» месьціцца пастарунак.

### Цяцерыну аддалі «Раўбічы»

**Кіраўніком спарткомплексу «Раўбічы» замест Аляксандра Хандогіна, які займаў гэтую пасаду 13 гадоў, прызначаны асабісты трэнэр Лукашэнкі ў вялікім тэнісе Сяргей Цяцерын.** Хандогіна зьвінавацілі ў адсутнасьці ініцыятывы й здольнасьцяў да прыцягненьня інвэстыцыяў. Беларусь — адзіная краіна Эўропы, дзе кіраўнікоў спарткомплексаў прызначае кіраўнік дзяржавы.

### «Местное время» выйграла суд

**16 красавіка Менскі гарадзкі гаспадарчы суд часткова задаволіў пазоў ТАА «Местное время-пресс» да Менаблвыканкаму,** прызнаўшы несапраўдным рашэньне аб адмене рэгістрацыі прадпрыемства і газэты «Местное время». Яна можа аднавіць свой выхад ужо праз два тыдні. Патрабаваньня аб кампэнсацыі стратаў рэдакцыі суд не задаволіў.

### Камбайнэры спадзяюцца

**У камбайнэраў з Клецкага раёну Ўладзімера Бондарава і Пятра Пільневіча, якіх прызналі былі найлепшымі на жніве 2002 г.,** а пасьля асудзілі за падробку справаздачы — прыпіску нязжатых гектараў, зьявіўся шанец на апраўданьне. Мар'інагорскі суд пастанавіў адправіць іх у калёнію — аднаго на два, другога на тры гады. Але яны зьвярнуліся ў Цэнтар правоў чалавека, дзе ім дамаглі скласьці скаргу да старшыні менскага абласнога суду. Той спыніў выкананьне прысуду да дадатковага разьбіральніцтва.

### Мірны — трынаццаты



IREX-PROMEDIA

**У новым рэйтынгу Асацыяцыі тэністаў-прафэсіяналаў Максім Мірны займае 13 месца.** Пасьля міжнароднага турніру ў партугальскім Эштарыле ён узьняўся на восем пазыцыяў. Меў бы там сёмае месца, калі б у паўфінале нечакана не прайграў расейцу Мікалаю Давыдзенку.

**СМ, АВ; БелаПАН, радыё «Свабода»**

# Генэтычна вы ня зьменіцеся

У Нацыянальным прэс-цэнтры адбылася прэс-канфэрэнцыя «Чарнобыльская навука: посьпехі, праблемы, пэрспэктывы» з удзелам намесьніка старшыні Камітэту па праблемах ліквідацыі наступстваў на ЧАЭС пры Саўміне Валер'я Шаўчука, старшыні Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай абароне Якуба Кенігсбэрга і дырэктаркі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтру радыяцыйнай мэдыцыны і экалёгіі чалавека Элеаноры Капітонавай. Яны паказалі погляд беларускіх навукоўцаў на стан чарнобыльскіх тэрыторый і небясьпеку для здароўя беларусаў.

Як зазначыў В.Шаўчук, «вернута ў эксплюатацыю» пакуль няшмат забруджаных земляў. Сам працэс іх вяртаньня гаспадарцы эканамічна нявыгадны, хоць, паводле радыяцыйных паказьнікаў, землі прыдатныя для выкарыстаньня. У Брагінскім раёне адна гаспадарка хацела вярнуць 70 га, але вымушаная была адмовіцца: няма каму апрацоўваць тую зямлю. І другая прычына: на большую плошчу пасеваў не стае ўгнаеньняў. А калі ў глебе мала ўгнаеньняў, расьліны цягнуць зь яе радыенукліды. Акрамя таго, у чарнобыльскіх раёнах не стае працоўных рук. Тым ня менш, Беларусь пачынае маштабную рэабілітацыю забруджанай зямлі.

Я.Кенігсбэрг пэўны, што адсяленьне з забруджаных тэрыторыяў трэба спыніць. На сёньня, кажа ён, адсяляць трэба толькі адзін населены пункт на Магілёўшчыне. Гэта хутар, на якім жыве адзін чалавек — яго ўжо вывозілі калісьці, а ён вярнуўся. Агулам за 17 гадоў з «зоны» адселеныя 140 тыс. чалавек.

Узьнікла гаворка і пра вядомы даклад Міжнароднага навуковага камітэту па вывучэньні атамнай радыяцыі пры ААН (UNSCEAR), які выклікаў шмат нараканьняў з боку беларускіх дасьледчыкаў (гл. «НН» № 17 за 2001 г. і № 16 за 2002 г.). Беларусь дабілася яго перагляду. У той жа час зь некаторымі высновамі беларускія навукоўцы цяпер пагаджаюцца. Так, ужо сёньня казаць пра генэтычнае ўзьдзеяньне Чарнобыльскай катастрофы нельга. «У Японіі дозы апраменьваньня былі большыя, чым у нас, але нават там доўгатэрміновыя наступствы выявіліся толькі праз 20—30 гадоў. Дый тое ў трэцім пакаленьні яны зьніклі. Наяўнасьць генэтычных наступстваў не пацьвярджаецца», — кажа Я.Кенігсбэрг.

**АШ**

КУРАПАТЫ

# Ахоўная зона

**У полі ля Курапатаў геадэзісты пачалі пазначаць межы дзялянак пад катэджы. 15 красавіка прадстаўнік Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны склаў акт аб парушэньні прадпісаньняў Дэпартамэнту і абласной пракуратуры. Не зважаючы на патрабаваньні закону, будаўнічыя фірмы працягваюць «асвойваць» пляц.**

Галоўным аргумэнтам зацікаўленых у пабудове жытла ў «пасёлку Сонечным» дагэтуль была адсутнасьць праекту зонаў аховы вакол Курапатаў. Урочышча ўнесенае ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў у 1993 г. пад №1, але не было абазначана, якая менавіта тэрыторыя мусіць ахоўвацца. Новы генплян разьвіцьця Менску, зацьверджаны пры канцы 2002 г., распрацоўваўся без уліку зонаў аховы Курапатаў.

Цяпер праект ахоўнае зоны вакол нэкропалю існуе. Замоўцам яго выступіла Асацыяцыя ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, а выканаўцам — інстытут «Праектрэстаўрацыя». Найбліжэйшым часам адбудзецца разгляд праекту ў абласным упраўленьні архітэктуры.

Паводле праекту, разам з 25 га Курапацкага лесу ў ахоўную зону ўвойдзе поле (яшчэ 25 га), праз якое ішла «дарога сьмерці» да ўрочышча. Гэтая зона мае быць абкружаная 300-мэтровым «бар'ерам» — зонай ахоўнага ляндшафту. Агулам жа мэмарыял з зонамі аховы зойме плошчу ў 80—100 га.

Тацяна Косьціч — начальніца аддзелу УП «Праектрэстаўрацыя», распрацоўшчыца праекту ахоўнае зоны вакол Курапатаў, перакананая, што гэта не зашмат для такога помніка. «Помнік павінен быць заўважны здалёк. Спрэчная тэрыторыя — поле. Ад яго ідзе і назва колішняй вёскі, а цяпер мікраёну — «Зялёны Луг». Значыць, гэта элемэнт характэрнага гістарычнага ляндшафту. Апрача таго, праз тое поле ішла дарога, якой везьлі людзей на расстрэл». Т.Косьціч параўноўвае Курапаты з Трасьцянцом, які мае плошчу каля 400 га, Хатынскім мэмарыялам, Катыньню, нямецкімі мэмарыяламі на месцах былых канцлягераў.

Навукова абгрунтаваны і дасканала распрацаваны праект праходзіць зацьверджаньне ў інстанцыях, але навуковая кіраўнічка мэмарыялу Мая Кляшторная кажа, што небясьпека застаецца: «Што рабіць, калі зацьвердзяць праект, дзе ахоўная зона будзе значна абрэзаная?» Адзіным ратункам яна бачыць шырокую грамадзкую кампанію ў абарону Курапатаў.

**Аркадзь Шанскі**



IREX-PROMEDIA

# Аляксандар Дабравольскі:

**Аляксандар Дабравольскі — адзін з самых дасьведчаных беларускіх палітыкаў. Сваю палітычную кар’еру ён распачаў яшчэ як дэпутат Вярхоўнага Савету СССР, цяпер зьяўляецца намесьнікам старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі. У інтэрвію «НН» А.Дабравольскі распавядае пра стратэгію апазыцыі на будучых парлямэнцкіх выбарах, пра канкурэнтаў Лукашэнкі і скандалы вакол АГП, а таксама пра свае ўражаньні ад судовага працэсу над дысыдэнткай Аксанай Новікавай, на якім ён выступаў у якасьці сьведкі.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**У шмат якіх краінах ладзяцца т.зв. «папярэднія выбары». Гэты варыянт можа вырашыць большасьць праблемаў.**

# «Не хачу быць прэзыдэнтам»

**«НН»: Як Вы ставіцеся да дэпутацкай групы «Рэспубліка» і яе ініцыятывы па зборы подпісаў за зьмены ў Выбарчым кодэксе?**

**А.Д.:** Наша партыя ладзіць кансультацыі з групай «Рэспубліка», хоць я і не лічу законным дзяржаўным органам палату прадстаўнікоў. Асноўная праблема ня ў тым, што ў краіне кепскія законы, а ў тым, што іх ніхто не выконвае, паколькі яны нявыгадныя ўладзе. Таму трэба ня толькі прывесьці заканадаўства ў адпаведнасьць міжнародным абавязацельствам Беларусі, але і забясьпечыць яго выкананьне. Дый для зьмены заканадаўства мала ўнесьці праект на разгляд у палату. Трэба арганізаваць унутраны і вонкавы ціск на ўлады, каб яны яго прынялі.

У Беларусі законнасьць бароняць ня тыя людзі, якія павінны гэта рабіць паводле сваіх службовых абавязкаў, а такія, як Новікава. Яна не юрыст, але яна сумленны чалавек, таму і выступіла супраць парушэньня закону ва ўсіх сфэрах. Паводле фармальных прыкметаў, не спрабуючы нават разабрацца (бо ім страшна гэта рабіць), пракурор Пазьняк і судзьдзя Есьман гатовыя судзіць жанчыну, маці малога дзіцяці. Гэта проста жудасна.

**«НН»: Ці паўплывала прызнаньне палаты прадстаўнікоў эўрапейскімі структурамі на міжнародную дзейнасьць АГП?**

**А.Д.:** Мы бачым галоўную праблему ня ў тым, каб паказаць, што Лукашэнка дрэнны, а ў тым, каб вярнуць давер да нашай краіны, зрабіць так, каб міжнародная сытуацыя ўплывала на перамены ў Беларусі. За апошні год-паўтара адбыліся вельмі сур’ёзныя зьмены ў грамадзкай думцы. Людзі хочуць пераменаў, але яшчэ ня ведаюць, што іх ужо большасьць.

**«НН»: Як вы ацэньваеце сёньняшні ўплыў ЗША на сытуацыю ў Беларусі?**

**А.Д.:** ЗША заўсёды былі заклапочаныя сытуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі, заўсёды цьвёрда выказвалі сваю пазыцыю, вельмі прынцыпова яе адстойвалі. Не дэманстравалі дзіўнай гнуткасьці, як гэта часам робяць эўрапейскія структуры, якія быццам бы і хочуць, каб нешта палепшала, але могуць пагадзіцца, каб было і горш… Цяпер у Кангрэсе ЗША абмяркоўваецца «Акт аб дэмакратыі ў Беларусі». Гэта можа вельмі станоўча паўплываць на сытуацыю. Але ключ ад нашых праблемаў знаходзіцца тут, у Беларусі.

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. адзінства апазыцыі перагварылася ў неадзінства. Прычына тут ня толькі ў прэзыдэнцкіх амбіцыях партыйных лідэраў. Даволі пасьпяхова працуе ўлада, высілкі якой накіраваныя на раскол апазыцыі. Таксама адсутнічае давер паміж лідэрамі. І прычыны ня толькі псыхалягічныя: часам ёсьць маральныя падставы, якія дазваляюць сумнявацца, ці можна гаварыць з гэтым чалавекам, дамаўляцца. Калі мы ня вырашым гэтых праблем, бессэнсоўна спадзявацца на дапамогу звонку.

**«НН»: У апошнія паўгоду адбылося некалькі гучных скандалаў, зьвязаных з АГП.**

**А.Д.:** У нас былі праблемы. Двое сяброў нашай партыі рабілі некаторым людзям дакумэнты на выезд за мяжу і бралі за гэта грошы. Іх мы выключылі з партыі. Былі выпадкі, калі падрабляліся сяброўскія білеты АГП. Летась падраблялі нашы партыйныя білеты нейкія ўкраінцы. У Бэльгію ці Галяндыю прыехалі аж пяць такіх «партыйцаў»...

У Менску выйшлі з партыі два чалавекі, прычым адзін зь іх — кіраўнік раённай арганізацыі, а другі — сябар рады менскай гарадзкой арганізацыі. Няўрадавыя арганізацыі перакупляюць партыйных людзей, запрашаюць да сябе на працу, але ставяць умову, што чалавек павінен быць беспартыйным. Трое сяброў АГП выйшлі з партыі, бо ім паставілі такія ўмовы. Зараз яны будуць працаваць у т.зв. «новай сыстэме назіраньня». Гэта вельмі цынічныя праекты.

**«НН»: Якая будзе стратэгія АГП на хуткіх парлямэнцкіх выбарах?**

**А.Д.:** Ёсьць тры варыянты. Першы — ісьці на выбары паасобку і нічога не ўзгадняць. Так можна было рабіць на мясцовых выбарах, але на парлямэнцкія гэтая тактыка ўжо ня пройдзе. Другі — узгадніць усе акругі. Гэты варыянт вельмі рэальны, і нават з тымі партыямі, зь якімі ў нас звычайна дыялёг не ўдаецца, мы маглі б гэта зрабіць і падтрымалі б некаторых беспартыйных кандыдатаў. Трэці — зрабіць супольны блёк, з супольнай праграмай, паліттэхналёгіямі. Тэарэтычна гэта быў бы найлепшы варыянт, але практычна нас чакаюць цяжкія перамовы, узгадненьне праграмы, мэтаў, прынцыпаў... Выйсьце — зрабіць кароткую праграму: незалежнасьць, дэмакратыя, рынкавая эканоміка.

Ёсьць і такі аспэкт. Калі мы схілімся да трэцяга варыянту, а нашых кандыдатаў проста паздымаюць з дыстанцыі? Калі будзе толькі адзін кандыдат у адной акрузе і ніякай падстрахоўкі? Трэба рэалізаваць больш хітрую тактыку...

**«НН»: Ці мае АГП свайго кандыдата альбо кандыдатаў у прэзыдэнты Беларусі?**

**А.Д.:** Ён мусіць быць вядомы, папулярны, а з гэтым якраз цяжкасьці. Хтосьці з такіх людзей ужо перастаў працаваць, баючыся за сваё жыцьцё. Таму трэба зрабіць так, каб людзі ведалі, хто можа быць альтэрнатывай, але адначасова і не падставіць кандыдата раней часу.

Цяпер мы абмяркоўваем гэтае пытаньне. Зь некалькіх кандыдатаў у прэзыдэнты пасьля будзе абраны адзін, але ня так, як перад прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 г., калі выбіралі самі кандыдаты.

**«НН»: А якім чынам?**

**А.Д.:** У шмат якіх краінах ладзяцца т.зв. «папярэднія выбары». Гэты варыянт можа вырашыць большасьць праблемаў.

**«НН»: Вы ня думаеце выставіць на прэзыдэнцкія выбары сваю кандыдатуру?**

**А.Д.:** Не хачу! Мне падабаецца быць свабодным чалавекам, а быць прэзыдэнтам азначае, што давядзецца ў значнай ступені страціць свабоду. Да таго ж, я даволі крытычна стаўлюся да сябе і не лічу, што я ідэальны кандыдат.

**«НН»: Ці падтрымліваеце Вы Лукашэнку ў ягоным курсе на незалежнасьць?**

**А.Д.:** Я наагул Лукашэнку ня веру, ніводнаму яго слову. Лукашэнка хоча ўлады — гэта адказ на ўсе пытаньні. Гэта адзіная яго стратэгія, адзіная ідэалёгія. Усе астатнія існуюць толькі для таго, каб прыкрыць сапраўдную. Калі Лукашэнка зразумее, што Расея пагражае яго ўладзе, ён будзе змагацца за незалежнасьць. Але яго нельга назваць сапраўдным яе абаронцам.

**«НН»: Як бы дзейнічала АГП, калі б узьнікла рэальная небясьпека страты незалежнасьці ў выніку міждзяржаўных дамоў ці рэфэрэндуму?**

**А.Д.:** Ня думаю, што АГП можа заклікаць да ўзброенага супраціву. Мы ведаем склад нашай партыі, настроі сярэдняга беларуса. Але, думаю, знойдуцца і такія людзі. І спробы анэксаваць Беларусь не дадуць станоўчага выніку. Гэта мы якраз і тлумачым расейскім палітыкам. Кажам, што гэта можа стаць новым фактарам разбурэньня Расеі. Цяпер нікому ня трэба новыя канфлікты. А гэта будзе менавіта новы канфлікт. І тыя, хто выступае сёньня за нерадыкальныя сродкі палітычных дзеяньняў, могуць ператварыцца ў радыкалаў.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

# Як зламалі руку Кішкурну



Антон Кішкурна, сын кіраўніка менскай гарадзкой арганізацыі БНФ «Адраджэньне», ляжыць у 6-й бальніцы з зламанай рукой. Яму зрабілі апэрацыю, гіпс здымуць толькі праз месяц.

Інцыдэнт адбыўся 26 сакавіка каля Савецкага раённага суду сталіцы. Бацьку Антона, Уладзімера Кішкурну, судзілі за ўдзел у сьвяткаваньні Дня Волі. Сын прывёз яму цёплую вопратку і ежу. «Ціхарам» не спадабалася бел-чырвона-белая налепка на шкле аўтамабіля Антона. Узьнік канфлікт, і хлопца сілаю вывалаклі з машыны. Пры гэтым і зламалі руку. Міліцыянты склалі на Кішкурну пратаколы «за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі» і паркоўку машыны «ў недазволеным месцы». Адвакат хлопца падаў па факце пашкоджаньня здароўя скаргу ў пракуратуру.

Антону Кішкурну 19 гадоў, ён — навучэнец эканамічнага каледжу, цяпер у акадэмічным адпачынку. Увосень ён ужо ламаў руку. Не пасьпела загаіцца, як цяпер зламалі паўторна.

**АТ**

# Нацбанк хітруе

**Пятро Пракаповіч прапанаваў Расеі заведама непрымальны кампраміс.**

Кіраўніцтва Расеі працягвае настойваць на ўвядзеньні супольнай валюты ў якасьці перадумовы міждзяржаўнае інтэграцыі. Для Беларусі такі варыянт непрымальны.

На сустрэчы з кіраўніцтвам Цэнтрабанку Расеі Пятро Пракаповіч запрапанаваў кампраміс: Беларусь адмаўляецца ад права на эмісію наяўных грошай, аднак Расея мусіць цалкам пакрыць «страты» ад такой адмовы. Расея павінна даць Беларусі «тэхнічны крэдыт», які тую (пакуль не названую) суму цалкам пакрые. Слова «крэдыт» ужытае для зьмякчэньня фармулёўкі: вяртаць яго Беларусь ня будзе. Пракаповіч спаслаўся на досьвед новых чальцоў Эўразьвязу, што патрабуюць ад Цэнтральнага эўрапейскага банку кампэнсацыі за страту манэтарнага сувэрэнітэту. Паводле пагадненьняў, што былі заключаныя раней, Цэнтрабанк ужо абавязаўся даць Беларусі 200 млн. даляраў ды 4,5 млрд. расейскіх рублёў (каля 150 млн. даляраў) крэдыту на стабілізацыю курсу нашага рубля.

Між тым, эмісія наяўнага рубля ня ёсьць вызначальнай для грашовай сыстэмы. Галоўнае — эмісія безнаяўнага рубля, ад якой Беларусь ня мае намеру адмаўляцца.

Расейскае інтэрнэт-выданьне «Газета.ru» ад прапановы Пракаповіча ў лёгкім трансе: «Пра якія страты Беларусі размова, не зусім зразумела. Беларусь, наадварот, можа нямала зэканоміць на друку банкнотаў».

Калі Расея адмовіцца «плаціць за чарговы крок да аб'яднаньня», дык прызначанае на 1 студзеня 2005 г. увядзеньне адзінай валюты не адбудзецца. Зрэшты, Пятро Пракаповіч пасьля вяртаньня з Масквы назваў яшчэ тузін прычынаў, чаму супольная валюта немагчымая: няма супольнай гаспадарскай прасторы, адзінага Падатковага кодэксу, мытнай прасторы, пэўнасьці зь беларускай запазычанасьцю за газ і расейскімі цэнамі на яго, адзінага рынку каштоўных папераў і г.д.


IREX-PROMEDIA

Расейскі бок папрасіў месяц на роздум.

**МБ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## ВУП падрос

**Аб'ём валавога ўнутранага прадукту ў першым квартале вырас на 5,6%.** Прамысловая вытворчасьць вырасла ў першым квартале на 6,7%, сельскагаспадарчая — на 1,2%. Уведзена ў эксплюатацыю 892 тыс. кв. м жытла, ці на 40,8% болей, чым у студзені—сакавіку 2002 г.

## Шапікі пастаяць

**Канчатковы дэмантаж менскіх камэрцыйных шапікаў, прызначаны на 1 ліпеня, адкладаецца на паўгоду.** У сталіцы не збудавана яшчэ ніводнага буйнога гандлёвага цэнтру, у які маглі б перайсьці прадпрымальнікі.

## Іваноў замест Дагенгарта

**З 15 красавіка Міжнароднай фінансавай карпарацыяй у Беларусі кіруе Іван Іваноў.** Ягоным папярэднікам быў Карл Дагенгарт, які знаходзіўся на гэтай пасадзе з 1998 г. Іваноў па нацыянальнасьці баўгарын. Ён вучыўся ў Маскве ды Парыжы і працаваў апошнім часам у расейскім холдынгу «Simimpex Co. Ltd.». Галоўная мэта МФК ў Беларусі — спрыяць разьвіцьцю бізнэсу, у прыватнасьці праз крэдытаваньне.

## Зноў прыватызацыя

**Чарговая хваля прыватызацыі мусіць накрыць 192 наваствораныя ААТ.** Міністэрства эканомікі ўжо падрыхтавала адпаведны сьпіс. Найбольшы ў працэнтавых адносінах пакет акцыяў (100%), які дзяржава пастанавіла аддаць у прыватныя рукі, — гомельскага ААТ «Карал», што вырабляе каляровыя кінэскопы ды кварцавае шкло. Аддадуць таксама кантрольныя пакеты заводу «Слуцак-Модуль» (51%), жодзінскага «Рэмізу» (59,3%), менскага прадпрыемства «Арбіта-сэрвіс» (65%).

## Паркоўка падаражэла

**Уладальнікі аўто мусяць плаціць за паркоўку ў Менску па-новаму.** Да 20 хвілінаў — 0,03 базавай велічыні, за гадзіну — 0,06 б. в. Цяпер базавая велічыня складае 13300 рублёў.

**АК**

**«Наша Ніва»** запрашае
да супрацоўніцтва рэкламныя агенцтвы і агентаў па рэкляме на выгадных умовах.
Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.

Т./факс: 284-73-29.

# «Гольф» у свае вароты

## «Фальксваген» будзе зьбіраць машыны не ў Абчаку, а ў Закарпацьці

**Пашанцавала людцам, што жывуць ва ўкраінскім мястэчку Саламонава, што пад Ужгарадам. Замест таго каб падавацца за бліжкі сьвет на заробкі, яны зьбіраюць «шкоды» ды «аўдзі» на тамтэйшым заводзе «Эўракар». Летам працы паболее: з канвэеру сыдуць першыя ўкраінскія «фальксвагены».**

Кіраўніцтва канцэрну «Фальксваген» у роспачы: заходні спажывец, напужаны войнамі, тэрактамі ды эканамічнай нестабільнасьцю, набывае менш легкавікоў. Найгорш ідуць справы ў ЗША — там продажы канцэрну зьменшыліся на 17% у параўнаньні зь леташнім узроўнем. Адна надзея на ўсходнеэўрапейцаў, звыклых да катаклізмаў і прагных да добрых, але недарагіх аўто.

Ужо ў ліпені на заводзе, што належыць украінскаму ЗАТ «Эўракар», пачнуць зьбіраць легкавікі мадэлі «пасат». Калі справа пойдзе гладка, да іх далучацца «гольф», «бора» ды «пола». Зборку наладзяць па тэхналёгіі SKD: зь Нямеччыны будуць везьці пафарбаваныя кузавы і дэталі, а рабочыя «Эўракару» будуць іх скручваць.

Кажуць, што немцам насамрэч патрэбен не завод на Ўкраіне, а мытныя льготы. Везьці празь мяжу гатовыя машыны з заводу ў Вольфсбургу дорага, а разабраныя легкавікі мытай не абкладаюцца.

Аднак кіраўніцтва «Фальксвагену» не разглядае «Эўракар» як гурток «зрабі сам». Саламонава пойдзе па шляху польскага заводу «Шкода-Фальксваген» у Познані. У 1991 г. там наладзілі буйнавузлавую зборку (як цяпер у Саламонаве). Пасьля пакрысе перайшлі да глыбокай канвэернай зборкі — акурат як у Нямеччыне. Украінцы будуць выкарыстоўваць ня толькі экспартаваныя, але і айчынныя дэталі. «Фальксваген» ужо падпісаў дамовы з 23 заводамі краіны на вытворчасьць запчастак да сваіх легкавікоў.

### Аўтаінтэграцыя

Экспансію на ўкраінскі рынак «Фальксваген» пачаў праз «Шкоду» — сваё даччынае прадпрыемства. Першыя «шкоды» на «Эўракары» пачалі зьбіраць у сьнежні 2001 г. Летась вырабілі 2010 легкавікоў. Чэхам так спадабалася якасьць, што акрамя «фабіяў» ды «актавіяў», прызначаных для паспалітых людзей, заводу дарычылі выпускаць прэстыжныя «шкоды супэрб». У канцэрне «Аўдзі» прыгледзеліся да канкурэнтаў ды таксама замовілі заводу ў Саламонаве зборку мадэляў «А4» ды «А6».

Вабіць замежнікаў і тое, што завод знаходзіцца ў вольнай эканамічнай зоне «Закарпацьце» з адпаведнымі падатковымі льготамі. Украінскія ўрадоўцы нездарма кажуць, што разглядаюць «Эўракар» у кантэксьце эўрапейскай інтэграцыі: да яго нават праклалі ад славацкай мяжы чыгунку з эўрапейскімі «вузкімі» рэйкамі.

### У гіт-парадзе — «украінцы»

Цяпер «Фальксваген» прадае ва Ўкраіне каля 3 тыс. новых легкавікоў у год. З дапамогай заводу ў Саламонаве, які можа вырабляць іх штогод 15 тыс., гэтую лічбу зьбіраюцца падвоіць. У плянах — падвысіць вытворчыя магутнасьці заводу да 45 тыс. машынаў у год.

Аднак пакуль на Ўкраіне «фальксвагены» саступаюць больш папулярным «шкодам» і «дэў». Гэтая тройка лідэраў цалкам складаецца з «айчынных» аўто, бо «дэў» зьбіраюць на Запароскім аўтазаводзе, а «шкоды» — на «Эўракары». Папулярнасьць залежыць ад цаны. Саламонаўскія «фальксвагены» будуць купляць лепей: замежны легкавік каштуе на 15—20% даражэй за аналяг украінскай зборкі. А якасьцю яны ня дужа будуць розьніцца ад закардонных: усе рабочыя «Эўракару» цягам некалькіх месяцаў праходзяць падрыхтоўку за кошт канцэрну на заводах «Шкода» ў Чэхіі.

### Ім — грошы, нам — чуткі

«Фальксваген» зьбіраецца будаваць і сэрвісныя станцыі. Ва ўкраінскіх гарадах актыўна ствараюць сетку сэрвіс-цэнтраў «Шкоды». Нам застаецца толькі глытаць сьлінкі, думаючы пра добрааплатныя працоўныя месцы, што чакаюць украінцаў.


**На зборачным канвэеры заводу «Эўракар»**

Ці азначае гэта, што «Фальксваген» больш ня мае патрэбы будаваць завод у Беларусі? Зусім не. «Эўракар» перш за ўсё мусіць задавальняць патрэбы ўкраінскага рынку. Аб'ёмы выпуску легквікоў будуць вызначаць запросы тамтэйшых аўтадылераў. Нават у Расею танныя «фальксвагены» на экспарт ня пойдуць. Таму чуткі пра тое, што немцы выкупяць былы завод «Форд» у Абчаку, працягваюць лунаць у паветры. Іншая справа, ці застануцца яны чуткамі назаўжды.

**Алесь Кудрыцкі**

# «Financial Times Deutschland»: ўкладаць грошы ў Беларусь выгодна

**Папулярная дзелавая газэта «Financial Times Deutschland» у артыкуле, прысьвечаным інвэстыцыйнай палітыцы заходніх банкаў, прадказвае посьпех тым адважным, якія ўкладуць інвэстыцыі ў банкаўскую сыстэму Беларусі. Мы прапануем скарочаны пераклад артыкулу.**

Аўстрыйская банкаўская група «Raiffeisenzentralbank Osterreich» (RZB) разгортвае дзейнасьць на Ўсходзе Эўропы. RZB хоча купіць банкі ў Казахстане і Ўкраіне, а таксама павялічыць сваю долю ў беларускім «Прыёрбанку».

Пасьля падзеньня жалезнае заслоны менавіта аўстрыйскія банкі найбольш скарысталі з выгоды сваёй геаграфічнай блізкасьці да рынкаў былых краінаў Варшаўскае дамовы. Усходняя Эўропа стала галоўным рынкам для канцэрну «RZB». На прасторы ад Марыбору да Масквы канцэрн зарабляе больш, чым у самой альпійскай рэспубліцы.

«Мы будзем рухацца сямімільнымі крокамі», — кажа генэральны дырэктар RZB Гербэрт Стэпіч. Чысты прыбытак ва ўсходнеэўрапейскім рэгіёне сёлета павінен перавысіць 200 млрд. эўра. Як і ў 2002 г., сёлета плянуецца адкрыць 100 новых філіяў. Колькасьць кліентаў павінна ўзрасьці з 1,9 да 3 млн. Кліенты «Прыёрбанку» складуць 300 тысячаў.

Разам з бэльгійскім банкаўскім і страхавым канцэрнам «KBC», «Hypo Vereinsbank», італійскім «Unicredito» і францускім «Societe Generale», «RZB» зьяўляецца адным з самых буйных гульцоў на банкаўскім рынку Ўсходняй Эўропы. Але ягоная роля на заходнім рынку нязначная.

RZB паклаў пачатак сваёй экспансіі на Ўсход яшчэ летась, калі купіў «American Bank of Kosovo» і славенскі «Bank Krekova». Колькі месяцаў таму быў набыты «Прыёрбанк». Стэпіч станоўча ацэньвае шанцы на посьпех у Беларусі шматзначнай фразай: «Краіна была тэхнапаркам Савецкага Саюзу».

У 2002 г. «RZB» уклаў ва ўсходнія праекты 450 млн. эўра. На будучыню прадугледжаныя штогадовыя інвэстыцыі ў памеры 200—250 мільёнаў.

**Падрыхтаваў СБ**

# Кучма хоча перанесьці выбары

## Гутарка з дэпутатам Вярхоўнай Рады Ўкраіны Ўладзімерам Бондарам

**Нядаўна Беларусь наведаў дэпутат украінскага парлямэнту, сябра фракцыі В.Юшчанкі «Наша Ўкраіна» Ўладзімер Бондар. Ён браў удзел у міжнародным моладзевым сэмінары «Стратэгія зьменаў» і наведаў рэдакцыю «НН». Паводле словаў дэпутата, ва Ўкраіне сёньня адчуваецца недахоп інфармацыі пра падзеі ў Беларусі. Мы ж папрасілі У.Бондара распавесьці пра сытуацыю ва Ўкраіне напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г.**


IREX-PROMEDIA

Віктар Юшчанка (зьлева) мае добрыя шансы ў 2004 г. зьмяніць Леаніда Кучму (справа) на пасадзе прэзыдэнта Ўкраіны.

**«НН»: Ці пойдзе Леанід Кучма на трэці тэрмін?**

**У.Б.:** Наўрад ці. Канстытуцыя не дазваляе, а каб яе зьмяніць, Кучма ня мае падтрымкі 2/3 парлямэнту. Прэзыдэнт рыхтуе перанос выбараў. Але, зноў жа, парлямэнт яго ў гэтым не падтрымае.

**«НН»: Наколькі моцныя ўплывы Расеі на палітычную сытуацыю ва Ўкраіне?**

**У.Б.:** Большасьць нашых сур’ёзных прадпрыемстваў сёньня належаць расейскаму капіталу. Ён уплывае на палітыку праз лябіраваньне сваіх інтарэсаў. Апроч таго, Кучма моцна залежыць ад Расеі, шукае там паразуменьня. Каб працягнуць тэрмін свайго прэзыдэнцтва, ён паступаецца эканамічнымі інтарэсамі Ўкраіны.

Дый многія палітычныя сілы Ўкраіны карыстаюцца паслугамі расейскіх піяр-агенцыяў для распрацоўкі ўласнай стратэгіі. Расейскія паліттэхнолягі працуюць на ўкраінскім палітычным рынку і пэўныя свае ідэі закладаюць празь дзейнасьць гэтых партый.

**«НН»: Як «Наша Ўкраіна» зьбіраецца супрацьстаяць гэтаму ўплыву?**

**У.Б.:** Наступным крокам у барацьбе з прарасейскімі ўплывамі будзе вылучэньне кандыдата ў прэзыдэнты — Віктара Юшчанкі. Ён, калі быў прэм’ерам, ставіў на першы плян інтарэсы Ўкраіны, а не якой іншай дзяржавы. Наш блёк якраз і вызначаецца тым, што займае не прарасейскую, не празаходнюю, а праўкраінскую пазыцыю.

**«НН»: Чый бок возьмуць левыя сілы на выбарах? Ці будуць яны праводзіць свайго кандыдата?**

**У.Б.:** Левыя сілы ва Ўкраіне неаднародныя. Камуністычна арыентаваныя людзі, якіх ва Ўкраіне цьвёрдыя 20%, не прагаласуюць у першым туры за В.Юшчанку. Больш памяркоўныя прыхільнікі партыі Аляксандра Мароза, людзі нацыянальна сьвядомыя, якія трымаюцца клясычных сацыял-дэмакратычных поглядаў. Яны могуць падтрымаць нашага кандыдата, а гэта каля 10% выбарцаў Украіны.

**«НН»: Ці магчымыя фальсыфікацыі на выбарах?**

**У.Б.:** Перад мінулымі выбарамі мы прынялі новае выбарчае заканадаўства. Яно зрабіла немагчымымі фальсыфікацыі на ўзроўні выбарчых камісіяў, што цяпер фармуюцца з прадстаўнікоў палітычных партый.

**«НН»: Які ўплыў маюць улада і апазыцыя на электронныя СМІ ва Ўкраіне?**

**У.Б.:** Улада мае вельмі вялікі ўплыў — праз пасярэдніцтва фінансавых структураў, якія кантралююць тыя СМІ. Таму гаварыць пра прысутнасьць апазыцыі на экранах не даводзіцца. Тое самае можна сказаць і пра буйныя газэты. Апазыцыя працуе толькі з пэўнымі рэгіянальнымі каналамі, выдае рэгіянальную прэсу.

**«НН»: Зь якімі палітычнымі сіламі ў Беларусі Вы кантактуеце?**

**У.Б.:** Мы сустракаліся з прадстаўнікамі БНФ, але гэта адна апазыцыйная палітычная сіла, хоць і самая сур’ёзная з нашага пункту гледжаньня. Іншыя палітычныя сілы, якія мелі б уплыў і былі празаходнія, праэўрапейскія і прадэмакратычныя, нам невядомыя. А мы хацелі б зь імі мець кантакты, у тым ліку і на рэгіянальным узроўні.

**«НН»: Як бы Вы ацанілі такія кантакты ў рамках праекту эўрарэгіёну «Буг»?**

**У.Б.:** Эўрарэгіён «Буг» стварылі Валынская вобласьць Украіны, Берасьцейская вобласьць Беларусі і Люблінскае ваяводзтва Польшчы. Дзейнасьць гэтага аб’яднаньня цяпер набывае асаблівае значэньне, бо да нашых межаў падыходзіць Эўропа.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

# Нямецкі друк пра сустрэчу Шродэра, Шырака і Пуціна

Кёльнская **«Rheinischer Merkür»** мае вялікія сумневы ў выніковасьці пецярбурскае сустрэчы прэзыдэнтаў. У артыкуле «Наколькі трывалая вось?» яна ацэньвае адносіны з Расеяй: «Пасьля інтэграцыі Расеі ў структуры NATO Шродэр схільны больш ангажаваць яе ў эўрапейскую палітыку абароны й бясьпекі. Расея прапануе сябе эўрапейцам у якасьці пастаўніка энэргіі, авіябудаўніка, партнэра па разнастайных мірных ініцыятывах альбо па выведнай дзейнасьці. Нямеччына выступае за раўнапраўнае сяброўства Расеі ў «вялікай васьмёрцы», а Расея падтрымлівае Нямеччыну ў яе імкненьні зрабіцца сталым сябрам Рады Бясьпекі ААН.

Далёка ня ўсе немцы падзяляюць эйфарыю канцлера ў дачыненьні да Расеі. Традыцыйная бэрлінская эліта цалкам робіць стаўку на трансатлянтычныя сувязі. Старшыня ХДЗ Ангела Мэркель раіць не забывацца, што ў цяжкія часы менавіта Амэрыка, а не Расея выступае стратэгічным партнэрам Нямеччыны», — піша кёльнскі штодзёньнік.

Рэспэктабельная **«Frankfurter Allgemeine Zeitung»** разважае: «Менавіта Шродэр запрасіў Шырака далучыцца да яго на перамовах з Пуціным. Гэта яшчэ адно пацьверджаньне таго, што Нямеччына і Францыя шукаюць тактычнага альянсу з Масквой у замежнапалітычных і вайсковых пытаньнях».

**«Hannoversche Allgemeine Zeitung»** выносіць прысуд: «У Пецярбургу сабралася «вось нямоглых». Маскве, Парыжу й Бэрліну, піша гановэрская газэта, нічога не ўдалося — ні абараніць свае эканамічныя інтарэсы, ні захаваць мір. Адзінае, чаго дамагліся, — раскалолі Захад. Можа, гэта і адпавядае інтарэсам Пуціна, але не Нямеччыны. Шродэру ня варта было б скакаць пад францускую і расейскую дудкі.

На старонках друку сваё стаўленьне да сустрэчы Пуціна, Шродэра і Шырака выказалі многія нямецкія палітыкі. Адзін з кіраўнікоў хрысьціянска-дэмакратычнай апазыцыі ў парлямэнце Вольфганг Шойбле заявіў на старонках **«Rheinische Post»**: «Пецярбурская сустрэча толькі паглыбіць ужо наяўны раскол у Эўропе. Эўропе трэба кінуць шукаць «асаблівыя шляхі» і ствараць «восі». Сустрэча ў Расеі — гэта крок не туды. Калі гаворка ідзе пра сустрэчу на вышэйшым узроўні прадстаўнікоў трох эўрапейскіх краінаў, лепш было б, каб замест Расеі ў ёй узяла ўдзел Вялікая Брытанія».

Адгукнуўся на апошнія падзеі і былы нямецкі канцлер Гельмут Коль. У **«Passauer Neue Presse»** ён піша: «Пасьля сканчэньня ірацкай вайны Эўропа павінна зноў вярнуцца да адзінай лініі ў галіне замежнай палітыкі і бясьпекі. Ва ўсеэўрапейскім доме няма месца для ўтварэньня восяў. Немцы павінны радавацца, што ўпершыню ў сваёй гісторыі жывуць у сяброўстве з усімі суседзямі. Раскол ЭЗ на прыхільнікаў і праціўнікаў вайны ў Іраку ня можа стварыць перашкодаў на шляху эўрапейскай інтэграцыі». У інтэрвію штодзённай газэце **«Die Welt»** Коль папракнуў свайго пераемніка Шродэра ў тым, што той бесцырымонна змабілізаваў у перадвыбарчай барацьбе страх немцаў перад вайной. Калі б Нямеччынай кіраваў Коль, краіна ўзяла б бок Амэрыкі. Адначасова экс-канцлер засьцярог ЗША ад аднабаковых замежнапалітычных дзеяньняў: «Ня можа быць і гаворкі пра «амэрыканскі сьвет», у якім усіх астатніх строяць».

**«Berliner Zeitung»** выглядае выспачкай аптымізму: «Ня трэба перабольшваць праблемаў у нямецкаамэрыканскіх стасунках. Менавіта Бэрлін іграе асноўную ролю ў адраджэньні эўрапейскага адзінства. Нямецкі ўрад мае асаблівую вагу, бо, нягледзячы на ўсе апакаліптычныя прароцтвы, ён працягвае спалучаць трансатлянтычную й панэўрапейскую арыентацыю».

Радыё **«Deutsche Welle»**, туманна камэнтуючы пецярбурскія падзеі, нагадвае пра адмову Кофі Анана прыехаць на сустрэчу: «Ён устрымаўся ад гэтага ў складаней для ААН абстаноўцы». У выпадку развалу ААН, гаворыць «Deutsche Welle», найбольш пацерпіць Расея. У Францыі і Нямеччыны ёсьць свае наладжаныя і праверaныя спосабы ўплыву на Вашынгтон. Для Масквы ж месца ў Радзе Бясьпекі зьяўляецца самым магутным рычагом.

**Падрыхтавалі Сяргей Богдан,**
**Віталь Станішэўскі**

## Дакумэнты пра злачынствы ў Чачэніі

Французская газэта **«Le Monde»** надрукавала копію справаздачы, падрыхтаванай, як сьцьвярджаецца, памочнікамі кіраўніка прамаскоўскае адміністрацыі Чачэніі Ахмада Кадырава і перададзенай у сакавіку Ўладзімеру Пуціну. Паводле справаздачы, за 2002 г. у Чачэніі было забіта 1314 цывільных асобаў. Падаецца й сьпіс з 49 выяўленых месцаў масавых пахаваньняў. У адным зь іх, у цэнтры Грознага, выяўлена 260 целаў. Паблізу дачнага пасёлку Ханкала, дзе месьціцца найбольшая расейская вайсковая база, знойдзена 43 трупы, у Алхан-Кале — 35 і г.д.

У другой частцы дакладу пералічаныя забойствы, выпадкі знаходкі целаў зь сьлядамі гвалтоўнае сьмерці ды чалавечых парэшткаў. Пра магчымую датычнасьць да злачынстваў расейскіх войскаў сьведчыць іх дыслякацыя ў найбліжэйшых ад месцаў забойстваў чачэнскіх вёсках.

У студзені—сакавіку 2003 г. у Чачэніі зафіксавана 70 забойстваў, 126 выкраданьняў, 19 зьнікненьняў і 25 выпадкаў знаходжаньня фрагмэнтаў чалавечых целаў.

Навошта ж быў зроблены гэты даклад? Газэта тлумачыць яго падрыхтоўку амбіцыямі Кадырава, які хацеў бы ўмацаваць свае палітычныя пазыцыі і зьменшыць уплыў вайскоўцаў, што акупуюць рэспубліку.

Прэс-сакратар Крамля па Чачэніі Сяргей Ястржэмбскі не пацьвердзіў і не абвергнуў інфармацыі пра справаздачу.

**Паводле «Le Monde»**

## Воршы стала болей

**Да Воршы далучаныя зямельныя ўчасткі агульнай плошчай 581,3 га.** Гэта зямля, якой ужо некалькі гадоў карыстаюцца жыхары Воршы. У склад гораду ўвайшло і т.зв. «царскае сяло» — новая шыкоўная катэджная забудова па вуліцы Дубровенскай. Сталі гараджанамі жыхары вёсак Малыя Ліпкі, Ярашэвічы, шматпавярховак вёскі Андрэеўшчына. Яны палепшаць статыстыку, бо колькасьць насельніцтва Воршы апошнім часам зьніжаецца.

## Сьцяг бяз зайца

**Зацьверджаныя герб і сьцяг гарадзкога пасёлку Копысь (Аршаншчына).** Мястэчка ўпершыню згадваецца ў летапісе пад 1059 г. Герб, атрыманы ў 1781 г., — у зялёным полі чорны заяц. Эталён сьцягу зроблены менскімі геральдыстамі. Ён уяўляе сабой прастакутнае палотнішча з гарызантальнымі палосамі белага, зялёнага і чорнага колераў. Як тлумачаць аўтары, колеры сымбалізуюць прыналежнасьць Копысі да Беларусі, надзею, радасьць, багацьце і мудрасьць. Заяц з гербу на сьцяг чамусьці не трапіў, як даўно няма яго ні ў навакольных лясах, ні нават у Чырвонай Кнізе. Копысь — месца нараджэньня прэзыдэнта Беларусі.

## Цуды ў манастырах

**Адразу чатыры абразы пачалі міраточыць у Ільінскай царкве Аршанскага Сьвята-Ўсьпенскага жаночага манастыра.** Сярод іх зусім новы абраз Пачаеўскай Божай маці. Паводле словаў манашкі Сергіі, якая гандлюе ў царкоўным шапіку, гэты абраз пажадала набыць адна прыхаджанка. Але калі манашка паспрабавала зьняць яго з паліцы, ён нібы прыліп да сьцяны, а праз некаторы час на ім зьявіліся крупелькі міра, што ператварыліся потым у струменьчыкі. І хоць экспэртыза абразоў не праводзілася, падзівіцца на іх могуць усе ахвотныя. Мясцовае тэлебачаньне паведамляе аб гэтым «бягучым» рэклямным радком. Адначасова ў Воршы назіраецца сапраўднае паломніцтва ў Куцеінскі Богаяўленскі мужчынскі манастыр. Сюды з Масквы прывезьлі часткі мошчаў сьвятога Панцеляймона.

## Шалёная лісіца

**Летась на Віцебшчыне было зарэгістравана 306 выпадкаў шаленства жывёл, а таксама адзін выпадак захворваньня на шаленства чалавека — жыхара Воршы**. Нядаўна ў вёсцы Рагазіна Аршанскага раёну была застрэленая шалёная лісіца. І хоць ніводны вясковец па мэдычную дапамогу не зьвярнуўся, райвыканкам абвесьціў у вёсцы каранцін.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

## Шалёная лісіца і пад Берасьцем

**Наш аднавясковец Іван Карнялюк у сябе ў хляве засьпеў лісу.** Паводзіла яна сябе ненармальна, не ўцякала. Ён забіў яе вілкамі і здаў на аналіз. Выявілася — шалёная. Летась увосень ліса пакусала сабак на суседняй чыгуначнай будцы. Вакцынаваная аўчарка выжыла, невакцынаваны цуцык здох. Старыя людзі кажуць, што шаленства заўжды праяўляецца ўвесну. На маёй памяці такой паморкі яшчэ не было. Цікава, ці ўлады цяпер дадуць рады бадзяжным сабакам і катам, якіх разьвялося да халеры на вакольных дачах.

**А.Карнялюк, Заказанка (Берасьцейскі раён)**

**«НН»:** У Столінскую раённую бальніцу паклалі 11 жыхароў вёсак Талмачова й Сямігосьцічы, што кантактавалі з шалёнымі жывёлінамі: кацянём і сабакам.

## Ня йдуць у лазьню

**За мінулы год мястэчковую лазьню, якая належыць жылкамгасу, наведалі ўсяго 20 тыс. чалавек.** Асноўныя прычыны нізкай папулярнасьці гэтай карыснай і патрэбнай для здароўя ўстановы — высокая цана ўваходнага квітка і вельмі нізкая культура абслугоўваньня.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

# Вербная нядзеля


IREX-PROMEDIA

**13 красавіка каталікі адсьвяткавалі Вербную нядзелю. У гэты дзень вернікі асьвячалі ў касьцёлах галінкі вярбы. Панаваў урачысты настрой: напярэдадні Вялікдзень. Шматлюдна было ў гэты дзень у мястэчку Ракаў (на здымку).**

IN MEMORIAM

# Зора Кіпель

14 красавіка адышла ў вечнасьць Зора Кіпель — літаратуразнаўца, вядомая грамадзкая і культурная дзяячка беларускай эміграцыі, жанчына, імя якой стаіць у адным шэрагу з імёнамі Ларысы Геніюш і Натальлі Арсеньневай.

Яна нарадзілася ў 1927 г. у Менску. Скончыла Беларускую гімназію імя Янкі Купалы ў Нямеччыне, а затым — Лювэнскі (Бэльгія) і Ратгерскі (ЗША) унівэрсытэты.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Некалькі дзесяцігодзьдзяў спн.Кіпель працавала ў балтыйска-славянскім аддзеле Нью-Ёрскай публічнай бібліятэкі. Рэдагавала газэту «Беларус», была сябрам управы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку, сябрам Амэрыканскай асацыяцыі славянскіх дасьледаваньняў.

Разам з мужам Вітаўтам Кіпелем уклала хрэстаматыю й бібліяграфію «Беларуская дзяржаўнасьць», бібліяграфічны даведнік «Янка Купала і Якуб Колас на Захадзе». Дасьледуючы беларускую рукапісную літаратуру XVI ст., пераклала на ангельскую мову «Аповесьць пра Трышчана».

Сёлета Зора Кіпель была прынятая ў ганаровыя сябры Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. Да сваіх апошніх дзён працавала над успамінамі. Ад пачатку 1990-х спадарыня Зора штогод прыяжджала ў Беларусь. Цяпер сюды будзе вяртацца яе душа.

Колькі месяцаў таму, магчыма, ужо прадчуваючы, што яе зямныя дні зьлічаныя, Зора Кіпель перадала Ўладзімеру Арлову ліст, які можна разглядаць як разьвітаньне зь сябрамі й калегамі.

### Зь ліста Зоры Кіпель да Ўладзімера Арлова

Я цяпер сур'ёзна занялася пісаньнем успамінаў пра сваё дзяцінства ў Менску і Крычаве ў 1930-х гадох. Зьдзецянела на старасьці гадоў, як некалі жартаваў наш сын Юрка (і адкуль такое слаўцо ў хлапца, які нарадзіўся ўжо далёка ад Беларусі, у Амэрыцы).

Вось жа, пішучы ўспаміны, перш-наперш усплыла патрэба пазнаць сваю сям'ю, і я пачала грунтоўна дасьледаваць сваю спадчыннасьць.

Дзяды мае з боку маці — дробная беларуская шляхта з Лагойшчыны. Прадзед — Пётра Раткевіч — пасьля Паўстаньня 1863 г. быў пазбаўлены шляхоцтва, бо не захацеў «пакланіцца» расейскаму цару Аляксандру, каб захаваць вернападданасьць і з гэтым шляхецкі стан. Засталіся толькі ўспаміны пра шляхоцтва, калі пасьля сьмерці бацькі сыны падзяліліся і мой дзед Язэп Раткевіч пераехаў у Менск у пачатку XX стагодзьдзя, пабудаваў добры дом на ўскраі Менску ў раёне Залатой Горкі. Калі мая мама Апалёнія Раткевіч пайшла ў царкоўна-прыходзкую школу (вось тут наша беларуская талерантнасьць), у яе школьным пасьведчаньні яшчэ стаяла «Дочь сына бывшего дворянина».

Сям'я бацькі — Савёнкі — з нашай славутай Глыбоччыны. Салідная беларуская праваслаўная сям'я.

У пачатку 1920-х гадоў мой бацька пераехаў у Менск, і тут у гэтыя абнадзейваючыя 1920-я гады Савёнкі й Раткевічы пазнаёміліся — у беларускім руху, зразумела, — і стварылі фактычна першую ў нашым родзе сьведамую беларускую сям'ю. Тата, журналіст-гумарыст, супрацоўнічаў у газэце «Савецкая Беларусь». Мама, пэдагог-выхавацелька, працавала з дзецьмі, моладзьдзю.

У гэтай сям'і нарадзілася й я, Зора Савёнак, 75 гадоў таму.

Воля лёсу (больш таго, накіраванасьць) зьвяла нашу сям'ю з другой, вельмі падобнай па долі і, да пэўнай ступені, па прафэсіях, ды асабліва па беларускасьці, — сям'ёй Кіпеляў. Але надышлі такія страшныя для Беларусі 1930-я і 1940-я гады, што фактычна выкінулі гэтыя сем'і зь Беларусі.

І гэтак паўстала новая беларуская сям'я — Зора і Вітаўт Кіпелі, але ўжо далёка ад Беларусі — у Амэрыцы.

Мы ў жыцьці стварылі адзінку. У ангельскай мове ёсьць вельмі трапнае слова «team». У спорце — гэта каманда, у бізнэсе — гэта група. У сям'і гэта, мусіць, найлепш перадаць як адзінка.

Мы маем розныя характары і мы не згубілі сваёй індывідуальнасьці. Мы дапаўняем адно другога, памагаем адно аднаму, у выпадках стрымліваем адно другога, часам падштурхоўваем. Мы — неразлучныя. Мы ўсё сваё жыцьцё аддалі БЕЛАРУСКАСЬЦІ.

Як Вітаўт любіць гаварыць — працуем для Беларусі па-за Беларусяй.

Дай нам Божа ўсім — Вам там, нам тут — памыснасьці, посьпехаў у нашай шляхотнай працы!

# Дзіна Харык



11 красавіка ў менскай бальніцы памерла ўдава габрэйскага паэта Ізі Харыка Дзіна Матліна (Харык). Было ёй пад 90 гадоў. Нарадзілася ў Бабруйску, скончыла габрэйскі пэдтэхнікум, пазнаёмілася з Харыкам у пачатку 1930-х. Як расстралялі мужа, органы НКУС арыштавалі і яе, назаўжды адарваўшы ад малых Юліка і Давідкі. Адбывала пакараньне ў Казахстане, у лягеры для жонак «здраднікаў радзімы». У хрушчоўскую адлігу яе рэабілітавалі; Пятрусь Броўка паклапаціўся, каб ёй далі кватэру ў сталіцы. Працавала выхавацелькай у дзіцячым садку, загадвала бібліятэкай Менскага аб'яднаньня габрэйскай культуры імя Ізі Харыка. Дзіне ня раз прапаноўвалі зьехаць за мяжу, у Ізраіль альбо ЗША — адмаўлялася. Нярэдка варажыла на картах і ўсё чакала — ці ня вернуцца дзеці… 14 красавіка на хаўтурах Дзіны Харык стары скрыпач граў габрэйскія мэлёдыі, якія яна калісьці гэтак любіла граць на піяніна для сваіх сяброў.

**ВР**

## 18 красавіка пятніца

### ● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Лінія абароны». Сэрыял.
9.15, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы».
10.50 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.30 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Маст. фільм «Алеся».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Гэта клясна!». Сэрыял. Заключная сэрыя.
16.25 5x5.
19.10 Маст. фільм «Кветкі правінцыі».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Атлянтыда».

### ● СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
5.55, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.20, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.20 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00, 18.15 «Менск і менчукі».
8.05, 22.40 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: камэдыя «Целаахоўнік і ўдава». ЗША, 1994.
9.45 «Каханьне». Дак. фільм.
10.25 «Гульнявы рэфлекс».
10.35 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.35 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.55 «Агенцтва». Сэрыял.
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
14.35 «ЗБЖ, ці ...». Тэлесэрыял.
16.20 Мультфільм.
16.45 «Мэдыкі». Сэрыял.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: баявік «Забі ці памры». ЗША, 2001.
22.50 «Навіны СНД».
23.40 Кіно: трылер «Дзіцячая гульня». Францыя, 2001.

### ● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 22.10 УльтраМікс.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Іншае жыцьцё».
10.45, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Сэрыял «Твінісы».
15.40 «Новы дзень». «Рэцэпты будыйскіх манахаў».
16.10 Дэтэктыў Агаты Крысьці «Забытае забойства». 2-я частка.
17.05 «Вялікае мыцьцё» з Андрэем Малахавым.
18.10 «Самі з вусамі».
18.40 Дак. дэтэктыў. «Хто забіў Ігара Талькова?»
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.40 Камэдыя «Паліцэйская акадэмія». ЗША, 1984 г.

### ● РТР

8.40 Сэрыял «Тайга».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія амазонкі».
21.00 Ала Пугачова, Піліп Кіркораў, Клара Новікова, Іосіф Кабзон у сьвяточным канцэрце.
22.30 Прэм'ера. Крымінальная драма «Спакушальнік» (ЗША). 2001 г.

### ● Культура

15.10 Дзень Перамогі войска Аляксандра Неўскага на Чудзкім возеры. С.Пракоф'еў. Кантата «Аляксандар Неўскі».
15.50 «Гербы Расеі».
16.05 «Са столі».
16.30 «Скандал вакол віктарыны». Дак. фільм.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Запіскі дыплямата. Анатоль Адамішын». Дак. сэрыял. Фільм 4-ы. «Ізноў у Італіі».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 Рэтраспэктыва фільмаў да 85-годзьдзя кінастудыі «Ленфільм». «Кепскі добры чалавек». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

### ● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Нацыянальная бясьпека». Расьсьледаваньне НТВ.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург».
17.20 Каманда.ru.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Дазвол на забойства».
22.30 «Усё адразу!».

### ● Эўраспорт

9.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
10.00 Вэляспорт. Трэк. Кубак сьвету. Паўтор.
11.00 Снукер. Кубак Эўропы. Мальта. Паўтор.
12.30, 17.30, 20.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
14.30 Футбол. Кубок Лібэртадорэс. 11-ы дзень. Паўтор.
16.30 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Пантыяк. Паўтор.
19.00 Сумо. Басё. Японія.
22.00 Формула.
22.15 Ралі. Новая Зэляндыя. Агляд.
23.15 Ралі Рэйд. Туніс.
23.45 Тэніс. WTA. Амэлія Айлэнд. Чвэрцьфінал.
1.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 19 красавіка субота

### ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Падрыхтоўка да вясельля». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе.
11.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Слуцкага раёну.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Дуброва. Родавы маёнтак Ваньковічаў».
12.55 Сола для дэбютанта. Ганна Хітрык (актрыса).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.00 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія). Фільм «Да самай сьмерці». 1-я сэрыя.
15.15 «Дабранач, мама!». Відэафільм АТН.
15.45 «Маршрут №...».
15.50 Кухня КВК.
16.00 «Містар Бін». Сэрыял.
16.30 КВК. 1/8 фіналу Эўралігі.
18.10 «На скрыжаваньнях Эўропы».
18.40 Мэлядрама «Знахар» (Польшча). 1-я і 2-я сэрыі.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Маст. фільм «Дотык рукі».
23.45 Сьвяточнае богаслужэньне на Вялікдзень у касьцёле сьв.Барбары. Перадача зь Віцебску.

### ● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Вайна і канфлікты» з цыклу «Вынаходкі старажытных». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 19.50 «СТВ-спорт».
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.15 «Адпачывай».
9.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Джуманджы». ЗША, 1997.
10.45, 20.05 Кіно: шматсэрыйны фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі». СССР, 1969.
12.05 «Разам».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: дэтэктыў «Расьсьледаваньне». СССР, 1980.
14.50 «Відавочца».
15.25 «Усё для цябе».
16.00 «Капітан Праўда». Сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Запрашаем паскардзіцца».
17.10 «Аўтапанарама».
17.30 Кіно: камэдыя «Налева ад ліфта». Францыя, 1987.
19.30 «24 гадзіны».
21.30 Кіно: трылер «Уцёкі». ЗША, 1994.
23.25 «Навіны СНД».
23.05 Кіно: трылер «Бязь імені».

### ● Першы музычны канал

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Смак».
10.35 Сьмехапанарама.
11.15 «Сярэбраны шар».
12.10 «Падарожжы натураліста».
12.40 «Новы дзень». «Крылы».
13.10 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Новы дзень». «Геніі і ліхадзеі».
14.45 Жывая прырода. «Браты па крыві».
15.40 Камэдыя «Кот у мяшку».
17.15 «Песьня году. Вясна».
19.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?» .
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Апошні герой-3».
21.55 Прэм'ера. Баявік «Выбітны». Ганконг—Кітай.
23.45 Трылер «Пагоня за сьмерцю». ЗША.

### ● РТР

8.45 Ранішняя пошта.
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Сьледзтва паказала». 1980 г.
15.00 Чэмпіянат Расеі па футболе. «Спартак—Аланія» (Уладзікаўказ) — «Лякаматыў» (Масква). Жывая трансьляцыя з Уладзікаўказу.
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Сусьветнае кіно. Авантурная камэдыя «Сэрцаедкі» (ЗША). 2001 г.
22.40 Трылер «Шэсьць» (Францыя). 2000 г.

### ● Культура

11.15 «Пецярбург-300». «Сумеснае пражываньне». Дак. фільм.
11.30 ГЭГ.
11.45 «Графаман».
12.10 Дзіцячы сэанс. «Кентэрвільскі прывід», «Хітрая варона». Мультфільмы.
13.20 «Дагістарычны сьвет». «Малюткі-монстры».
13.50 «Борхес і я». Дак. фільм.
15.05 «Срэбранае стагодзьдзе пецярбурскай рэжысуры». М.Булгакаў. «Дні Турбіных». Спэктакль Маладзёвага тэатру (Санкт-Пецярбург).
17.45 Магія кіно.
18.15 У вашым доме.
18.55 «Сфэры».
19.35 «Поўны нягоднік». Тэлесэрыял. 13-я сэрыя, заключная.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Легенда Багера Ванса». Маст. фільм.
23.20 «Пад гітару». Аляксандар Мірзаян.

### ● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Камэдыя «Мы з вамі дзесьці сустракаліся...»
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Камэдыя «Грошы вырашаюць усё» (ЗША).
18.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
18.35 Прэм'ера 2003 г. Дэтэктыў «Сышчыкі-2». 1-я сэрыя.
19.45 XVI Урачыстая цырымонія ўручэньня Нацыянальнай кінэматаграфічнай прэміі «Ніка».

### ● Эўраспорт

9.30 Рэйд прыгод. Паўтор.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. 11-ы дзень. Паўтор.
12.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
15.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
17.00, 20.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Жывая трансьляцыя.
19.00 Сумо. Басё. Японія.
22.00 Тэніс. WTA. Амэлія. Другі паўфінал. Жывая трансьляцыя.
0.00, 0.30 Экстрэмальныя віды спорту.
1.45 Формула-3000. Імола.

## 20 красавіка нядзеля

### ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Віншавальнае слова арцыбіскупа, Апостальскага нунцыя ў Беларусі Івана Юрковіча на Вялікдзень.
9.10 Алхімія слова.
9.15 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «Падрыхтоўка да вясельля». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Велікодныя пісанкі».
12.15 «Усё нармальна, мама!»
13.00 «Ваша лята».
13.40 Існасьць. Духоўная праграма.
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія). Фільм «Да самай сьмерці». 2-я сэрыя.
15.15 «Касыяпэя». Сэрыял.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.30 Кліп-абойма.
17.10 Драма каханьня «Франка» («Беларусьфільм»).
18.50 Іў Мантан у фільме-прытчы «ІР-5» (Францыя).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Камэдыя «Вясельны пярэпалах» (ЗША).

### ● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Джуманджы». ЗША, 1997.
10.40, 20.10 Кіно: шматсэрыйны фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі». СССР, 1969.
12.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно: музычная камэдыя «Чарнаморачка». СССР, 1959.
14.55 «Відавочца».
15.25 «Сусьветныя розыгрышы».
16.00 «Другое дыханьне». Сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін».
19.05 «Усё для цябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.30 «Гульнявы рэфлекс».
21.45 Кіно: трылер «Акно ў спальні». ЗША, 1987.
22.40 «Навіны СНД».
22.55 Музычная праграма «Песьні каханьня».

### ● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Армейскі магазын.
8.50 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.10 «Новы дзень». «Каралі сьмеху». «Прытворнікі».
12.40 «Клюб падарожнікаў».
13.20 «Ералаш».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валадар смаку».
15.15 Ток-шоў «Выбар».
15.55 «Куміры».
16.25 «Рэкорды «Вялікага мыцьця». Спэцыяльны выпуск.
18.15 КВК-2003. Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 Вялікая прэм'ера. Баявік «Улада агню».
23.05 Часы.
0.05 «Дзіброў-party».

### ● РТР

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.50 «Гарадок».
10.20 Парад камэдый. Маст. фільм «Тры ніндзя» (ЗША). 1998 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.15 Дыялёгі пра жывёл.
15.20 Сьвет на мяжы.
15.50 Пакой сьмеху.
16.50 Прэм'ера. Прыгодніцкі фільм «Конга» (ЗША). 1995 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Псыхалягічная драма «Інстынкт» (ЗША). 1999 г.
22.50 Чэмпіянат сьвету па аўтогонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Сан-Марына. Трансьляцыя з Імолы.

### ● Культура

11.10 «Пецярбург-300». «Завулак і яго насельнікі». Дак. фільм.
11.25 «Рыцары сьмеху». «Шчасьлівае сямейства».
11.50 Нядоўгія гісторыі.
12.05 Дзіцячы сэанс. «Салавей». Маст. фільм.
13.25 Ізноў пласьцінка пяе.
13.50 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.45 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.10 Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. Дж.Вэрдзі. «Аіда». Фільм-опэра.
18.00 Да 85-годзьдзя з народзінаў Георгія Віцына. «Апэрацыя «Юбілей».
18.40 «Па запалкі». Маст. фільм.
20.15 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы».
20.55 «Болей чым каханьне».
21.35 «Культ кіно» з Кірылам Разлогавым. «Трус». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

### ● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял па нядзелях. «Каханьне ўдаўца». 4-я сэрыя (ЗША).
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Уплыў».
12.05 Дэтэктыў «Разьвітальная гастроль «Артыста».
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 Экстрэмальны кантакт: рыфавыя акулы.
15.45, 16.06 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 «Найноўшая гісторыя». «Пакаленьне next».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
18.35 Дэтэктыў «Сышчыкі-2». 2-я сэрыя.
19.45 Фільм тыдня. Прэм'ера. Крымінальная камэдыя «Васабі».
21.35 Дэтэктыў «Паляваньне на сутэнёра».
23.30 Сэрыял «Клан Сапрана». 25-я сэрыя (ЗША).

### ● Эўраспорт

9.30 Тэніс. WTA. Амэлія. 1-ы паўфінал.
10.30 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Паўтор.
12.00, 21.30 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
14.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя. Жывая трансьляцыя.
16.00 Вэляспорт. Кубак сьвету. Жывая трансьляцыя.
18.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Эўропы. Грэцыя.
20.00 Тэніс. WTA. Амэлія. Фінал. Жывая трансьляцыя.
0.15 Аўтагонкі сэрыі наскар. Мартынсьвіл.
1.15 Аўтагонкі сэрыі індыкар. Матэгі.


# Стажыроўкі ў Польшчы для маладых навукоўцаў

Беларуская Асацыяцыя Рэсурсавых Цэнтраў, Фонд імя Сьцяпана Батуры аб'яўляюць конкурс на ўдзел у навукова-дасьледчых стажыроўках у Польшчы для маладых навукоўцаў, якія працуюць у галіне права, эканомікі і сацыялёгіі.

У конкурсе могуць узяць удзел асьпіранты і навуковыя супрацоўнікі да 35 гадоў. Стажыроўкі будуць праходзіць у польскіх навуковых установах і арганізацыях.

- Беларуская Асацыяцыя Рэсурсавых Цэнтраў
- Т.: (8-029) 624-57-23
- Т./факс: (017) 220-59-41
- Internet: www.barcnews.org/programs
- e-mail: kasia@barcnews.org
- Апошні тэрмін падачы дакумэнтаў — 30 красавіка 2003 году.

## 25 красавіка пятніца

**● БТ**

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Заля чаканьня». Сэрыял.
9.10, 17.05 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.50 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Кінараман «Лёс». Частка 2-я.
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял. 4-я сэрыя.
16.20 5х5.
19.10 Камэдыя «Там, дзе грошы» (ЗША—Канада).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Кінакамэдыя «Суседзі» («Беларусьфільм»).

**● СТВ**

5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
5.55, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.20, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 23.00 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 23.20 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: камэдыя «Рэцыдыў». ЗША, 1990.
9.40 «...З забыцьця і праху. Іаан Грыгаровіч» Дак. фільм.
10.25 «Гульнявы рэфлекс».
10.35 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.35 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.55 «Агенцтва». Камэдыйны сэрыял. Заключная сэрыя.
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
16.50 «Дружная сямейка». Камэдыйны сэрыял.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.15 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Місіс Даўтфаер». ЗША, 1993.
23.30 «Навіны СНД».
23.45 Кіно: трылер «Прывід».

**● Першы музычны канал**

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Іншае жыцьцё». Ток-шоў.
10.45, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Сэрыял «Твінісы».
15.10 «Крылы».
15.35 Маст. фільм «Паляваньне на аднарога».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Жыцьцё цудоўных людзей».
18.40 Дак. дэтэктыў «Не страляй, дзядзька Лёша!».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.45 Прэм'ера. Баявік «Паміж жыцьцём і сьмерцю». Беларусь, 2002 г.

**● РТР**

8.50 Сэрыял «Тайга».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншляг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Прэм'ера. Праграма «Кубак гумару».
21.50 Драма «Назіральнік» (ЗША). 2000 г.

**● Культура**

15.05 Сцэны каханьня вялікага Пучыні.
16.05 «Парыскі часопіс». «Цэнтар «Эўразія» ў цэнтры Эўропы».
16.35 Да 85-годзьдзя кінастудыі «Ленфільм». «Невядомы Хейфіц. Герой ня нашага часу». Прэм'ера дак. фільму.
17.30 Весткі.
17.40 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Чалавек са Стратфарду».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 Рэтраспэктыва фільмаў да 85-годзьдзя кінастудыі «Ленфільм». «Авадзень».
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 Навіны культуры з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там ...».

**● НТВ**

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Шчырае прызнаньне.
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Найноўшая гісторыя». «Пакаленьне next».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.05 «Бандыцкі Пецярбург: журналіст». Сэрыял.
17.20 Каманда.ru.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Ліцэнзія на забойства».
22.30 «Усё адразу!».

**● Эўраспорт**

9.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
9.45 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Ірвінгтан. Паўтор.
11.00 Футбол. Кубак УЭФА. Паўфінал. Паўтор.
12.00, 22.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
13.45 Матацыклетныя гонкі. Паўднёвая Афрыка. Жывая трансьляцыя.
16.00, 18.00 Тэніс АТР. Барсэлёна. 1/4 фіналу. Жывая трансьляцыя.
19.15 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд.
21.00 К-1. Сусьветны GP. Сайтама. Паўтор.
0.15 Самы дужы чалавек. Часопіс. Паўтор.
1.15 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 26 красавіка субота

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
8.05 Пяць цудаў.
8.15 «Не зявай!» Тэлеканал для дзяцей.
8.55 Час мясцовы. «Лета ў руцэ, ці Падарожжа з анёламі».
9.20 Экран індыйскага кіно. «Тры браты». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 Тэлевізійны Дом кіно.
12.15 «Тэатар. Выбранае». Менскі абласны драматычны тэатар.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Хохлава. Цэнтар драўлянага дойлідства».
12.55 Сола для дэбютанта. І.Цішкевіч (артыстка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.00 «Беларусь на скрыжаваньнях стагодзьдзяў». Відэафільм. Фільм 1-ы.
15.15 «Нялюбае Богам месца: сустрэча праз гады». Відэафільм АТН.
15.35 «Фінскі іспыт». Да адкрыцьця чэмпіянату сьвету па хакею-2003.
15.55 Хакей. Чэмпіянат сьвету. Канада — Беларусь. Трансьляцыя зь Фінляндыі.
18.20 «Дзяўчына сьпяшаецца на спатканьне». Маст. фільм.
19.30 Кінапрытча «Душа мая Марыя» (Беларусь).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.20 Галоўнае пытаньне.
22.10 Кінараман «Дом, у якім я жыву».
23.55 Сьвяточнае богаслужэньне на Вялікдзень у Менскім Сьвята-Духавым катэдральным саборы. Жывая трансьляцыя.

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Сэкс і каханьне» з цыклу «Вынаходкі старадаўніх». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 19.50 «СТВ-спорт».
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.15 «Адпачывай».
9.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Старая крэпасьць». СССР, 1973.
11.00, 20.05 Кіно: шматсэрыйны фільм «Ад'ютант яго эксцэленцыі». СССР, 1969.
12.15 «Разам».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: баявік «Я абвяшчаю вам вайну». Расея, 1990.
15.00 «Відавочца».
15.30 «Усё для цябе».
16.00 «Капітан Праўда». Камэдыйны сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Запрашаем паскардзіцца».
17.10 «Аўтапанарама».
17.30 Кіно: камэдыя «Дасканалы».
19.30 «24 гадзіны».
19.50 «СТВ-спорт».
21.25, 23.10 Кіно: маст. фільм «Андрэй Рублёў». 1-я сэрыя.
22.55 «Навіны СНД».

**● Першы музычны канал**

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 Смак.
10.35 Сьмехапанарама.
11.15 «Вяртаньне дадому. Уладзімер Жырыноўскі. Алма-Ата».
12.10 «Падарожжы натураліста».
12.40 «Раб і яго жанчыны». Дак. фільм.
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Любімыя песьні».
15.15 Маст. фільм «Рэйнджэр з атамнай зоны». Беларусь, 1999 г.
16.45 Да Дня чарнобыльскай трагедыі. «Падарожжа ў Атлянтыду». Дак. фільм.
17.10 Маст. фільм «Ты ёсьць...».
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Апошні герой-3». Заключная перадача.
21.55 Прэм'ера дак. фільму «Доктар Рашаль».
22.30 Вялікдзень. Трансьляцыя богаслужэньня з Храму Хрыста Збаўцы.

**● РТР**

8.45 Ранішняя пошта.
9.15 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Мужыкі!..».
15.00 Маст. фільм «Закаханы па ўласным жаданьні». 1982 г.
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншляг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Мэлядрама «Паўночнае зьзяньне». 2001 г.
22.20 «Велікодныя ўрачыстасьці ў Расеі». Жывая трансьляцыя Велікоднага богаслужэньня з Храму Хрыста Збавіцеля.

**● Культура**

11.05 Пецярбург-300. «Імгненьні на пуантах». Дак. фільм.
11.20 ГЭГ.
11.35 «Графаман». Аўтар і вядучы А.Шаталаў.
12.00 Дзіцячы сэанс. «Дзівак зь пятага «Б». Маст. фільм.
13.25 «Дагістарычны сьвет». «Тайна возера Лахнэс».
13.55 «Адзін дзень з жыцьця Пустыні». Дак. фільм.
14.25 Сярэбраны век пецярбурскай рэжысуры. «Цар Максімільян». Тэлевэрсія спэктаклю Новасібірскага тэатру «Глёбус».
16.20 «Партрэт». Хасэ Карэрас.
17.15 Магія кіно.
17.45 «Рамантыка рамансу».
18.25 «Сфэры».
19.05 «Краіна малпаў». Маст. фільм.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя». Кароль Георг VI і каралева Элізабэта.
21.00 Навіны культуры.
21.25 «Уся каралеўская раць». Маст. фільм.
23.15 «І даўжэй за век...».

**● НТВ**

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Вечны патоп». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Дэтэктыў «Чужыя тут ня ходзяць».
13.35 Усеправаслаўная малітва, сыходжаньне Благадатнага Агню. Жывая трансьляцыя зь Ерусаліму.
15.15 Гуляем у «Кено».
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Прыгодніцкі фільм «Народжаная вольнай» (ЗША).
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.40 Дэтэктыў «Сышчыкі-2: успышка». 1-я сэрыя.
19.55 Мэлядрама «Рымскія канікулы» (ЗША).
22.30 Велікоднае богаслужэньне ў Казанскім Катэдральным Саборы. Жывая трансьляцыя з Санкт-Пецярбургу.

**● Эўраспорт**

9.30 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Паўтор.
11.30 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс. Паўтор.
12.30, 19.30 Супэргоначны ўік-энд. Маны Кур. Жывая трансьляцыя.
13.45 Матацыклетныя гонкі. Паўднёвая Афрыка. Жывая трансьляцыя.
16.00 Тэніс АТР. Барсэлёна. 1/2 фіналу. Жывая трансьляцыя.
20.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд.
21.30 К-1. Сусьветны GP. Сайтама. Паўтор.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Тэніс АТР. Х'юстан.
1.45 Матацыклетныя гонкі. Паўднёвая Афрыка. Агляд.

## 27 красавіка нядзеля

**● БТ**

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал. Праграма пра войска.
9.05 Альхімія слова.
9.10 Слова Мітрапаліта Філарэта на Вялікдзень.
9.20 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.45 Экран індыйскага кіно. «Тры браты». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Шэдэўры беларускага іканапісу».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.35 Існасьць. Духоўная праграма.
14.05 «Беларусь на скрыжаваньнях стагодзьдзяў». Відэафільм («Белвідэацэнтар»). Фільм 2-і.
15.15 Сьвятыні Беларусі. «Спаса-Праабражэнскі храм у Заслаўі».
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 «Маршрут №...».
16.40 Кліп-абойма.
17.20 Музычны фільм «Мэры Попінс, да пабачэньня!». 1-я і 2-я сэрыі.
19.55 Хакей. Чэмпіянат сьвету. Швэцыя — Беларусь. Трансьляцыя зь Фінляндыі.
22.25 Панарама: падзеі тыдня.
23.15 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
23.35 Мэлядрама «Двое на востраве сьлёз». («Беларусьфільм»).

**● СТВ**

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: прыгодніцкі фільм «Старая крэпасьць».
10.40 Кіно: камэдыя «Афоня».
12.15 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.40 «Добры дзень, доктар!».
12.55 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.15 Кіно: крымінальная камэдыя «Гангстэры і падгузкі». ЗША, 1993.
14.45 «Чысты голас». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
15.05 «Відавочца».
15.35 «Сусьветныя розыгрышы».
16.05 «Другое дыханьне». Камэдыйны сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Навіны шоў-індустрыі».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
19.05 «Усё для цябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.10 Кіно: камэдыя «Будзьце маім мужам».
21.40 «Гульнявы рэфлекс».
22.00, 23.30 Кіно: маст. фільм «Залатое цяля».
23.15 «Навіны СНД».

**● Першы музычны канал**

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

**● АНТ**

8.00 Навіны.
8.20 Ералаш.
8.30 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.25 «Падарожныя нататкі».
10.45 Пакуль усе дома.
11.30 Дог-шоў.
12.10 «Шукальнікі». «Загадкавы востраў».
12.40 «Клюб падарожнікаў».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валадар смаку».
15.15 «Вялікія бацькі».
15.45 Ток-шоў «Выбар».
16.30 Камэдыя «Гэта ўсё яна». ЗША, 1999 г.
18.10 «КВК-2003». Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 «Залаты леў» Вэнэцыянскага фэстывалю. Мэлядрама «Вясельле ў сэзон дажджоў». Індыя—ЗША—Італія, 2001 г.
23.15 Часы.
00.15 Ала Пугачова. «Казкі пра каханьне».

**● РТР**

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.50 «Гарадок». Дайджэст.
10.20 Парад камэдый. «Мае блакітныя нябёсы» (ЗША). 1990 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Віншаваньне патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II.
13.25 Вакол сьвету.
14.20 Дыялёгі пра жывёл.
15.25 Пакой сьмеху.
16.20 Мэлядрама «Сабрына» (ЗША). 1995 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Сусьветнае кіно. Драма «Перагаворшчык» (ЗША). 1998 г.

**● Культура**

11.20 Пецярбург-300. «Сантымэнтальны вальс». Дак. фільм.
11.35 «Рыцары сьмеху». «У пагоню».
12.00 Нядоўгія гісторыі.
12.15 Прагулкі па Брадвэі.
12.45 «Спадчына чараўніка Бахрама», «Умка». Мультфільмы.
13.25 «Дагістарычны сьвет». «Сьвітанак эпохі дыназаўраў».
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі».
15.20 «У сьвеце танцу». «Казкі Хелпмэна». Дак. фільм.
16.15 Сьмеханастальгія.
16.40 «Князі, гусары, Мэфістофэль і пацак, ці Герой ня нашага часу».
17.20 «Ідыёт». Маст. фільм.
19.20 «Больш чым каханьне».
20.00 «Адкрыцьцё II Маскоўскага Велікоднага фэстывалю». Жывая трансьляцыя зь Вялікай залі кансэрваторыі.
22.00 «Культ кіно». «Касавокае шчасьце». Маст. фільм.

**● НТВ**

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял па нядзелях: «Каханьне ўдаўца» (ЗША). 5-я сэрыя.
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Уплыў».
12.05 Камэдыя «Пакроўскія вароты». 1-я і 2-я сэрыі.
14.50 Смачныя гісторыі.
15.15 Спорт «Лято 6 з 49».
15.20 Экстрэмальны кантакт: марскі мамант.
15.45 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.00 «Найноўшая гісторыя».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.35 Дэтэктыў «Сышчыкі-2: успышка». 2-я сэрыя.
19.40 Фільм тыдня: «Ільвіная доля».
21.50 Прэм'ера. Баявік «Асабліва небясьпечны злачынца» (ЗША).
23.50 Сэрыял «Клан Сапрана». 26-я сэрыя (ЗША).

**● Эўраспорт**

5.00, 8.30 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Японія. Жывая трансьляцыя.
5.45 Супэрспорт. Чэмпіянат сьвету. Японія. Жывая трансьляцыя.
7.00 Супэрбайк. Аўстралія. Паўтор.
9.30 Супэрспорт. Чэмпіянат сьвету. Японія. Паўтор.
11.00 Матацыклетныя гонкі. Паўднёвая Афрыка. Жывая трансьляцыя.
16.15 Супэргоначны ўік-энд. Маны Кур. Жывая трансьляцыя.
17.15, 0.45 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд.
18.30 Вэляспорт. Этап кубку сьвету.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Маны Кур. Спэцагляд.
21.00 Конны спорт.
22.00 Тэніс АТР. Барсэлёна. Фінал.
23.00 Тэніс АТР. Х'юстан. Жывая трансьляцыя.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Надзвычай шмат імпрэзаў на ўсе густы і ахвоты прапануе наступны тыдзень.**

### «Палітычная сфера»

**У сераду, 23 красавіка, а 18-й у Беларускім ПЭН-цэнтры (Казлова, 7-101)** адбудзецца прэзэнтацыя часопісу «Палітычная сфера», які выдае кола асьпірантаў БДУ. Выступяць рэдактары і аўтары выданьня, а таксама запрошаныя госьці, сярод якіх Ігар Бабкоў, Віталь Сіліцкі, Ніна Антановіч ды інш.

### Саксаманія-2003

**20 красавіка ў ДК МТЗ** упершыню зьбяруцца найлепшыя саксафаністы краіны. Там можна будзе пачуць, як граюць Антон Боеў з гуртам «Атава», квартэт Анатоля Радзюкова, квінтэт Паўла Аракеляна, «Новыя джазэры», Антон Машкала і «Дыліжанс». Пачатак а 19-й. Цана квітка да 10 тыс. рублёў.

### Віно з Каліфорніі

**У панядзелак, 21 красавіка, у бібліятэцы Дому літаратара (Фрунзэ, 5)** адбудзецца прэзэнтацыя новае паэтычнае кніжкі Валянціны Аксак «Віно з Каліфорніі». Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

### Краса і сіла

**Прэзэнтацыя анталёгіі Міхася Скоблы «Стагодзьдзе беларускай паэзіі»** з удзелам аўтараў адбудзецца 22 красавіка а 18.00 у Доме літаратара (вул.Фрунзэ, 5).

### Нефармат

**23 красавіка ў залі ДК «Юнацтва» (вул.Фабрыцыюса, 5)** адбудзецца фэст нетрадыцыйнага мастацтва «Нефармат». Ад 17.30 да 22.00 будуць граць псыхадэлічныя гурты й выступаць тэатры пэрформансаў. Зайграюць «Солнце-цветы» (адна з самых старых псыхадэлкамандаў), «Pras» (праект Улада Бубна), «Рацыянальная дыета» (фры-джаз), «ЗасраКазра» (праект Віктара Жыбуля). Сярод пэрформэраў — Алесь Пушкін (ён рыхтуецца паказаць свой твор «Раніца ў Кабуле»). Квіткі каштуюць 4000 руб.

### Суботнік ім.Агінскага

**26 красавіка ў Залесьсі (Смургонскі р-н)** адбудзецца суботнік. Усе, хто хоча дапамагчы ўпарадкаваць маёнтак Міхала Клеафаса Агінскага, — прыяжджайце! Ехаць да Залесься зь Менску трэба электрычкай (да Маладэчна), а пасьля гудагайскім дызэлем.

**Сяргей Будкін**

Якасна пераагучаную вэрсію відэафільму «Пан Тадэвуш» можна замовіць у «Беларускім відэаклюбе». Даведкі: а/с 150, 220107, Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402. E-mail: belvidea@hotmail.com

# «Рок-каранацыя»: прысьвячэньне Мулявіну

**15 красавіка быў зацьверджаны сьпіс намінантаў на сёлетнюю «Рок-карону» і створаны Статут Каранацы — правілы адбору кандыдатаў на прызы.**

Паводле іх, галоўную карону цяпер ня можа атрымаць супольны праект ці кампіляцыя — ні зборнікі БМА, ні «Personal Depeche» пераможцамі ў намінацыі «Выканаўца году» ня стануць. Нават «Баляды» Зьмітра Вайцюшкевіча ў сьпіс ня трапілі.

Ва ўсіх асноўных намінацыях фігуруе Лявон Вольскі. На галоўны прыз прэтэндуюць «NRM», «Крамбамбуля» і «Палац», на альбом году — «Дом культуры» «NRM», «Журавы» «Тройцы» ды «Чужыя дзеўкі» «Палацу», на «Найлепшы кліп году» — «Абсэнт» «Крамбамбулі», «Юность» «Ляпіса Трубяцкога» і «Калыханка» Сашы зь Сірожам.

Намінанты на «Песьню году» мусілі мець пастаянную ратацыю ў FM-этэры — гучаць хоць цягам двух тыдняў раз на дзень. Таму выбар быў невялікі: «Абсэнт» («Крамбамбуля»), «Лямпа» («Імпэт») і «Вэб-дызайн» («J-mors»).

«Personal Depeche» мае шанцы толькі ў намінацыі «Прадусар году». Тут Халадзінскі, Макараў і Старповіч — стваральнікі «нашых дэпэшаў» — будуць спаборнічаць з Ганнай Вольскай, прадусаркай «Крамбамбулі», і Арынай Вячоркай—Віталем Супрановічам, што зрабілі явай «Легенды Вялікага Княства». «Падзею году» аддалі без варыянтаў Першаму музычнаму каналу.

Ня будзе сёлета намінацыяў «Рок-князёўна» і «Музыка году», яны вычарпалі сябе. Затое ўручаць прыз найлепшаму рэгіянальнаму выканаўцу. У намінацыю «Адкрыцьцё году» вядомыя музыкі цяпер дапускацца ня будуць. Ні «Крамбамбуля», ні Памідораў зь «Сьвятам пакрадзеным», ні «Гарацкія» Піта Паўлава шанцаў тут ня маюць. Ці рэаніміюць новыя правілы самы буйны рокфэст — пабачым 25 красавіка ў КЗ «Менск».

**Сяргей Будкін**



IREX-PROMEDIA

**Шмат хто з рок-музыкаў крытыкаваў ранейшую канцэпцыю «Рок-каранацыі»**

# Маем рэч

**Працяг са старонкі 1.**

З.Герасімовіч шкадуе, што не ўдалося напоўніцу «праілюстраваць» манэты ВКЛ, паказаць прыватныя рэчы, кніжкі, нават гузікі з вопраткі славутых асобаў: «Словы застаюцца словамі, а візуальнае ўспрыманьне ўсё ж лепш».

Найсьціплейшым на ілюстрацыі пэрыядам мастак назваў першыя стагодзьдзі існаваньня Вялікага Княства (XIII—XIV ст.): «Вельмі мала тагачасных беларускіх выяваў, дакладных архітэктурных рэканструкцыяў». Былі цяжкасьці і з XVIII ст. А часам наадварот — паўставала праблема пакутлівага выбару. Да прыкладу, мастак меў аж чатыры варыянты партрэту Генрыха Валуа. Самым багатым на «карцінкі» выявіўся пэрыяд Адраджэньня і XIX ст.

«Я вельмі ўдзячны Сяргею Занкевічу, які аднойчы прынёс мне ілюстраваную «Гісторыю Баўгарыі». Захацелася зрабіць падобную беларускую кнігу. А сёньня можна ўпэўнена сказаць: у нас атрымалася лепш», — зазначае Ўладзімер Арлоў, аўтар тэксту. Кніга можа ўспрымацца на чатырох узроўнях. Першы — самі ілюстрацыі, разглядаючы якія, ужо атрымліваеш пэўнае ўяўленьне пра нашую мінуўшчыну. Другі ўзровень — подпісы пад выявамі. Трэці — вынаскі на палёх, дзе падаецца квінтэсэнцыя разьдзелу. Чацьверты — уся кніга цалкам.

Што новага пабачыць чытач, які ўжо мае «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі»? У.Арлоў адказвае так: «Мы пачынаем з больш раньніх часоў, чым «Дзесяць вякоў», дзе першая дата — 862 год.





Першы разьдзел «Краіны Беларусі» мае назоў "Да зьяўленьня чалавека", і вядзецца там пра час, калі большая частка сучаснай Беларусі была марскім дном».

Ад «Ілюстраванай храналёгіі гісторыі Беларусі», апублікаванай выдавецтвам «БелЭн», «Краіна Беларусь» розьніцца прынцыпам складаньня і якасьцю друку. «Мы імкнуліся паказаць беларускую гісторыю як частку агульнаэўрапейскага руху цывілізацыі. Падрабязна паказалі гісторыю старажытных княстваў, дзяржаўны лад ВКЛ, дзе асоба мела шырокія для сваёй эпохі магчымасьці самавыяўленьня, бо вярхоўная ўлада была абмежаваная радай і соймам, а гарады жылі паводле магдэбурскага права. Потым былі Рэнэсанс і Рэфармацыя, якіх, на вялікі жаль, ня ведалі нашыя ўсходнія суседзі», — тлумачыць У.Арлоў.

Аўтары не адмаўляюцца ад плянаў перавыданьня кнігі па-расейску. Але — толькі пасьля рэалізацыі беларускага выданьня. «Краіна Беларусь», нягледзячы на высокі кошт (каля 40 тыс. у кнігарнях) і ніштаваты наклад (5 тыс. асобнікаў), мае ўсе шанцы хутка разысьціся. Гэтаму спрыяюць паліграфічныя характарыстыкі кнігі, апублікаванай на мелаванай паперы ў славацкай друкарні «Neografia». «Каб знайсьці друкарню, я зладзіў тэндэр, — кажа З.Герасімовіч. — У Беларусі вельмі цяжка дасягнуць такой якасьці, ня здолелі б яе забясьпечыць ані ва Ўкраіне, ані ў Літве. Славацкая друкарня «Neografia» — найлепшая ва Ўсходняй Эўропе: зь ёй працуюць немцы, палякі і нават славутае ангельскае выдавецтва «Dorling Kindersley».

З.Герасімовіч бачыць у падобных праектаў вялікую будучыню: «Надалей варта было б выдаваць гэткія ж якасныя, але меншыя аб'ёмам кнігі — старонак на 90 — вузейшай тэматыкі: гісторыя рыцарства, напрыклад».

У нас эўрапейская гісторыя. «Краіна Беларусь» — доказ, які немагчыма абвергнуць, мяркуюць аўтары.

**Адам Воршыч**

### Удакладненьне

Прызначаная на чацьвер прэзэнтацыя кнігі «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя» не адбылася з прычыны адмовы Нацыянальнай бібліятэкі ў арэндзе залі.

# Вайханскія засьпявалі па-беларуску

Барыс і Галіна Вайханскія ўпершыню засьпявалі па-беларуску. На канцэрце 15 красавіка ў тэатры Янкі Купалы расейскамоўныя барды выконвалі песьні на вершы Ўладзімера Караткевіча, Георгія Ліхтаровіча, а таксама ўласныя песьні Б.Вайханскага ў перакладзе Г.Ліхтаровіча. Апроч таго, гучалі песьні расейскіх і францускіх бардаў. Як адзначыў бард, «мы з Галінай ганарымся, што змаглі пераступіць нейкую мяжу і засьпяваць на вялікай беларускай мове».

Творы Б.Вайханскага ўжо гучалі ў беларускамоўным атачэньні: у 1980 г. ён стварыў музыку да казкі Р.Кіплінга «Кот, які гуляў сам па сабе», пастаўленай Купалаўскім тэатрам. Аднак першыя спробы расейскамоўных бардаў "адаптавацца" ў беларускай культуры адбыліся толькі на пачатку 90-х. У прыватнасьці, тады напісала свае першыя песьні па-беларуску Алена Казанцава.

Гэта ўжо ня першы выпадак (напр., Кулінковіч), калі творца лічыць, што найлепш самавыявіцца ён можа па-беларуску, а не-расейску.

**АШ**

# Пясэцкі не ў фаворы

Адмененая выстава «Ў краіне Вялікай Мядзьведзіцы», прысьвечаная творчасьці Сяргея Пясэцкага, што меласа адбыцца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Афіцыйнае тлумачэньне — заля занятая. Але, хутчэй, адміністрацыю напалохала асоба Пясэцкага — крымінальніка, кантрабандыста і ўдзельніка беларускай антысавецкай партызанкі. Гэта ўжо трэцяя за апошнія паўмесяца адмова Бібліятэкі ў правядзеньні кніжных прэзэнтацый. Адмовілі таксама ахвотным прэзэнтаваць кнігі «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя» Арлова ды Герасімовіча і «Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў» Катлярчука.





Выйшаў №2 незалежнага часопісу для маладых сем'яў «Дамініка». У нумары: дзеці, дом, каханьне, кантакты зь беларускамоўнымі сем'ямі ды іншыя тэмы. Пытайцеся ў рэдакцыі «Дамінікі», незалежных распаўсюднікаў і праз «Кнігі—поштай».

Т. для даведак: (8-0296) 43-57-33, а/с 333, 220050, Менск, exlibris@tut.by, глядзіце таксама ў Internet: http://exlibris.cjb.net

# Выстава Тарасэвіча ў Міляне

**У мілянскай галерэі «Lawrence Rubin» ніколі не было калёнаў. Тыдзень таму іх пабудавалі. Для чаго? Каб Лявон Тарасэвіч іх размаляваў.**

І ня толькі калёны — Тарасэвіч аздобіў самі сьцены галерэі рознакаляровымі гарызантальнымі палосамі, што ствараюць фон для трынаццаці ягоных працаў. Апрача тынку ды халсьцінаў, Тарасэвіч вырашыў скарыстаць для сваіх твораў… тканіну абажураў. На выставе спрэзэнтаваная калекцыя «Артыст» — пяць лямпаў італьянскага дызайнэра і архітэктара Мікеле дэ Люкі, абажуры для якіх выканаў менавіта Лявон Тарасэвіч. Пра гэтую выставу, што мае назву «Лявон Тарасэвіч сустракаецца зь Мікеле дэ Люкі», напісаў найбуйнейшы італьянскі штодзённік «Corriere della Sera».

Лявон Тарасэвіч задаволены выставай. «Мне далі ў карыстаньне ўсю галерэю, — кажа ён. — Ну, хіба акрамя пяці пастамэнтаў, на якіх стаялі лямпы Мікеле дэ Люкі. Але я і ў іх стварэньні паўдзельнічаў. Лямпы па частках прывезьлі да мяне ў Валілы (вёска на Беласточчыне, дзе ён жыве. — **«НН»**), а я зрабіў для іх абажуры».

Слова «абажур» этымалягічна абазначае зацяненьне, зацямненьне сьвятла. Таму Лёнік Тарасэвічварабіў заслоны, кожная зь якіх мае дзьве паверхні, і на кожнай намаляваныя пэйзажы. Яны падзеленыя яшчэ на чатыры часткі. Камбінацыя з ультрамарынам дазволіла адшукаць эфэкт, які часам назіраецца надвячоркам: рэчы, якія былі цёмныя днём, робіцца сьветлымі, як на нэгатыве. Падобнае і ў лямпах: ультрамарын робіцца сьвятлейшы, а іншыя колеры гаснуць.

Лявона Тарасэвіча зь Мікеле дэ Люкам лучыць ня толькі мастацтва, але і захапаленьне птушкагадоўляй. Мікеле вучыўся дызайну на курынай фэрме, а Тарасэвіч вядомы як апантаны гадавальнік экзатычных птушак.

**АК**



# Моўная палітыка ў Швэцыі



**Сёньня ў швэдзкіх унівэрсытэтах вывучаюцца ўсе дзяржаўныя мовы Эўропы, апроч беларускай.**

Сучасная Швэцыя лічыцца самай ангельскамоўнай (апроч Вялікабрытаніі ды Ірляндыі) краінай Эўропы. Па-ангельску ў Швэцыі добра размаўляюць амаль усе: 70-гадовая бабуля ў краме, электрык жыльлёвай канторы, прыбіральнік мэтро. Хоць перад вайною Швэцыя была краінай з другой нямецкай мовай школы й навукі. Алаіза Пашкевіч-Цётка, якая ў 1914 г. прайшла ўсю Швэцыю пешшу, гаварыла зь людзьмі па-нямецку.

Але пасьля 1945 г. лідэрамі сьвету зрабіліся ЗША ды Вялікабрытанія. І швэды першымі ў Эўропе пераарыентавалі сыстэму адукацыі зь нямецкай на ангельскую мову. Апошняя зрабілася абавязковай мовай школы, роўнай па гадзінах выкладаньня з швэдзкай. Яна ж сталася другой мовай унівэрсытэцкай адукацыі. Дапамагло й тэлебачаньне: усе ангельскамоўныя праграмы, у тым ліку дзіцячая анімацыя, ідуць на мове арыгіналу з швэдзкімі субтытрамі. Дзіця за 5—10 гадоў гуляючы вывучае размоўную ангельскую.

Таму на пачатку 1960-х, калі амэрыканскі бізнэс прыйшоў у Эўропу, значная частка інвэстыцый была ўкладзеная менавіта ў Швэцыю. Спрыяла адсутнасьць моўнага бар'еру. Свабоднае валоданьне ангельскай мовай адчыніла швэдзкім бізнэсоўцам шлях да сусьветнага рынку. Сучасная Швэцыя — унікальны прыклад малой краіны, якая мае вялікі бізнэс. Ангельскамоўнасьць дазваляе не перакладаць на швэдзкую тысячы навуковых кніжак, што забясьпечвае вялікую эканомію, апэратыўнасьць і адкрытасьць да ўсіх навінак. Ведаючы ангельскую, эмігрант ці турыст дасьць сабе рады ў Швэцыі.

У краіне ёсьць чатыры гістарычныя меншасьці: саамі (тры моўныя групы), фіны, швэдзкія фіны («Tornedal Finish»), жыды. Усе меншасьці маюць рэалізаванае права на дзяржаўныя школы з выкладаньнем усіх прадметаў на роднай мове. Унівэрсытэт Умэа дае ім магчымасьць атрымаць вышэйшую адукацыю.

У месцах кампактнага пражываньня этнасаў фіна-вугорскай групы (поўнач краіны, правінцыя Нурботэн) усе ўрадоўцы, апроч швэдзкай, абавязаныя бездакорна ведаць мову меншасьці й адказваць на ёй, калі пытаюцца. Дзяржаўная дакумэнтацыя, пошта, шпіталь, вулічныя і дарожныя шыльды таксама дзьвюхмоўныя.

Дый сама швэдзкая мова мае дыялекты. Ня дзіва: шчыльнасьць насельніцтва невялікая, ляндшафт складаны, гаспадарка — спрадвеку хутарская. Дыялект «сконэ» розьніцца ад нарматыўнай мовы, як украінская ад беларускай.

Да 1960-х сыстэма адукацыі працавала ў кірунку ўніфікацыі, але потым швэды вырашылі, што гэта нядэмакратычна. Таму сёньня на практыцы існуе толькі адзіная пісьмовая мова. На родных дыялектах штодзённа й паўсюль гаворыць ня толькі люд паспаліты, але і палітыкі, журналісты, дыктары тэлебачаньня. На думку філёлягаў, менавіта гэтае багацьце ў разнастайнасьці забясьпечвае росквіт мовы.

Першымі эмігрантамі ў Швэцыю былі (XIII—XVII ст.) немцы, галяндцы й бэльгійцы. Пасьля другой сусьветнай вайны туды ўцякалі эстонцы й латышы. У 1960—70-я на працу ехалі фіны, грэкі, югаславы, паўднёваамэрыканцы.

У Швэцыі кожны эмігрант мае права вывучаць два гады ў спэцыяльнай школе швэдзкую мову. А потым удасканальвацца ў бясплатных вечаровых школах для дарослых. Усё гэта — за дзяржаўны кошт. Дзеткі новых эмігрантаў вывучаюць мову ў спэцыяльнай падрыхтоўчай клясе.

> Сярод славянскіх эмігрантаў у Швэцыі занепадае кірыліца. Ад яе адмовіліся нават сэрбы.

Зь іншага боку, урад фінансуе дзейнасьць нацыянальных суполак. У Стакгольме, дзе жыве большасьць эмігрантаў, прымаюцца тэлеканалы асноўных этнічных групаў (Фінляндыя, Грэцыя, Ірак, Чылі, Турцыя, Іран, Сэрбія, Харватыя, Конга, Польшча, Расея і г.д.).

Ва ўсіх бібліятэках можна замовіць кніжкі на роднай мове, пачытаць газэты. Урад гарантуе кожнаму вучню па жаданьні бацькоў бясплатныя дадатковыя ўрокі роднай мовы.

Кожная эміграцкая супольнасьць мае права адчыніць нацыянальную школу. З 1613 г. у цэнтры гораду спраўна дзейнічае нямецкая школа, тамсама месьцяцца школы старых эміграцыяў (эстонская, грэцкая і г.д.). Новыя эміграцкія супольнасьці (польская, расейская) адчынілі за апошні час школы на ўскрайку места.

Сярод славянскіх эміграцкіх суполак Швэцыі занепадае кірыліца. Ад яе адмовіліся нават мясцовыя сэрбы — перайшлі на харвацкую лацінку. Асноўная прычына — Інтэрнэт. Лацінка дамінуе ў Сусьветным павуціньні. Нават расейцы пішуць электроныя лісты, карыстаючыся нязручнай амэрыканскай сыстэмай, дзе адзін гук «щ» перадаюць адразу чатыры літары. Дарэчы, і афіцыйная Расея пачала распрацоўку праграмы пераходу на лацінку. Кіраўнік праекту акадэмік Сяргей Аруцюнаў аўтарытэтна заявіў, што гэта адбудзецца праз 20 гадоў.

Калі працуеш з кампутарам у час глябалізацыі-ангелізацыі, прырастаеш да даміноўнага шрыфту. Гэты тэкст лацінкай я набраў бы ўдвая хутчэй.

Швэдзкае грамадзтва досыць атэістычнае. Але калісьці менавіта рэлігійны стан моцна паўплываў на лёс мовы. Швэцыя — лютэранская краіна, якая ўжо ў першай палове XVI ст. замацавала родную мову ў царкве і дзяржаўным справаводзтве. Менавіта таму швэдзкая выдатна распрацаваная ў навуковым і літаратурным сэнсе. З часоў караля Густава III (канец XVIII ст.) у краіне дзейнічае свабода веравызнаньня дзеля эмігрантаў. Ад 2000 г. швэдзкая царква ня ёсьць адзінай царквой швэдзкага народу і дзяржавы. Сёньня ў Стакгольме багата касьцёлаў з польскай, харвацкай, гішпанскай мовамі імшы, грэцкіх, сэрбскіх, эстонскіх ды расейскіх (манархічных і маскоўскіх) праваслаўных цэркваў, мячэтаў, ёсьць украінскі грэка-каталіцкі храм. У кожнай нацыянальнай парафіі працуе нядзельная школка, дзе, згодна з швэдзкім звычаем, пасьля набажэнства можна выпіць кавы ды пагутарыць зь землякамі. Швэдзкі Біблійны інстытут выдаў Сьвятое Пісьмо на большасьці літаратурных моваў сьвету (у тым ліку па-беларуску).

Ужо ў гімназіі (адпавядае беларускім 10—11 клясам) швэдзкім вучням прапануецца для дадатковага вывучэньня сьпіс з 5—6 моваў. Ва ўнівэрсытэце кожны студэнт можа выбраць любую замежную мову. Дарэчы, ВНУ ў Швэцыі дзяржаўныя, навучаньне бясплатнае, уступныя экзамены адсутнічаюць (конкурс атэстатаў, каб не было глебы для карупцыі). Студэнты атрымліваюць добрую стыпэндыю, маюць права на дзяржаўную беспрацэнтавую пазыку, якую вяртаюць цягам жыцьця. Абавязковыя для вывучэньня прадметы не займаюць усяго часу. Астатняе — вольны выбар. Студэнт можа штудыяваць кампутарныя тэхналёгіі разам з цывільным правам і японскай мовай.

Сёньня ў швэдзкіх унівэрсытэтах вывучаюцца ўсе дзяржаўныя мовы Эўропы, апроч беларускай. Адносна нядаўна ў Стакгольмскім унівэрсытэце адчынілася катэдра ўкраіністыкі. Швэды — народ прагматычны. Ведаюць, што ў Кіеве можна дамовіцца і па-расейску, але грошай на мову ўкраінскую не шкадуюць, бо гэта падстава добрых палітычных адносінаў з Украінай. Дый бізнэсоўцам дае магчымасьць працаваць у краіне, дзе ўсе афіцыйная паперы пішуцца па-ўкраінску.

Зацікаўленасьць беларускай мовай у швэдзкім грамадзтве ёсьць. Кніжкі пра нашую краіну Шэля Абрагамсана й Барбары Торнквіст-Плева разышліся вельмі хутка і сёлета перавыдадзеныя. Але швэды ня могуць выдаткоўваць грошы на вывучэньне мовы, якая не існуе ў палітычнай сыстэме краіны і якой не карыстаецца рэальная ўлада й бізнэс. Калі б хоць афіцыйныя лісты пісаліся і абвяшчаліся па-беларуску, нешта зварухнулася б. Трэба зразумець, што толькі вывучаючы чатыры ўнівэрсытэцкія гады беларускую мову, культуру і гісторыю, швэдзкі (ці іншы замежны) студэнт можа стаць спэцыялістам па Беларусі і далей прафэсійна працаваць на карысьць абедзьвюх краінаў. Амаль увесь спэктар адносінаў паміж Эстоніяй і Швэцыяй рухаюць сёньня выпускнікі дзьвюх швэдзкіх катэдраў эстоназнаўства. Швэдзкія ж спэцыялісты па Беларусі скончалі тутэйшы факультэт расеязнаўства.

**Андрэй Катлярчук, Стакгольм**



**Калі працуеш з кампутарам у час глябалізацыі-ангелізацыі, прырастаеш да даміноўнага шрыфту.**

## НА ТЫДНІ

### Вугоршчына, Мальта далучаюцца да ЭЗ

**Рэфэрэндумы па пытаньні далучэньня да Эўразьвязу адбыліся на Мальце і ў Вугошчыне.** У дунайскай краіне «за» прагаласавалі 84% выбарцаў, але актыўнасьць была надзвычай нізкай — 46%. Для параўнаньня: у апошніх выбарах там бралі ўдзел 70% выбарцаў. На Мальце далучэньне падтрыманае 54% галасоў. За далучэньне тамака выступае Нацыяналістычная партыя, супраць — лейбарысты. Рэфэрэндум раней адбыўся ў Славеніі, дзе «за» было 90%.

### У Расею — па замежным пашпарце

**Расейскае МЗС папярэдзіла, што неўзабаве паездкі ў краіну грамадзянаў зь дзяржаў «блізкага замежжа», у тым ліку й Беларусі,** будуць ажыцьцяўляцца толькі па замежных пашпартах.

### Рэха Іраку

**10 красавіка Арменія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Расея і Таджыкістан зладзілі сумесную командна-штабную трэніроўку сыстэмы СПА.** Для стварэньня становішча, набліжанага да баявых умоваў, задзейнічалі больш за 50 самалётаў і шрубалётаў.

### Ірацкія інтэлектуалы крытыкуюць ЗША

**У этэры тэлеканалу «Аль-Джазіра» мастак Ніда Казем, археоляг Талеб Багдадзі і гісторык Хашэм Ях'я Малях асудзілі** «стварэньне амэрыканскімі войскамі становішча, што спрыяе рабункам і бязладзьдзю». Яны бачаць у гэтым небясьпеку «зьнішчэньня Багдаду як гістарычнага, культурнага ды ісламскага цэнтру».

МБ

# Хведар Караленка: Чалавек-лічыльнік



**Стваральнік першага беларускага інтэрнэт-лічыльніка і каталёгу «Акавіта» (akavita.by) Хведар Караленка мае 28 гадоў. Ён нарадзіўся ў Жодзіне, скончыў БДУІР. Апроч тэхнічнай мае за плячыма музычную адукацыю — школу па клясе флейты, таксама грае на гітары. Музыка, музычныя сайты — ягонае хобі. Цяпер ён робіць інтэрнэт-старонку, прысьвечаную беларускім бальным танцам.**

**«НН»: З чаго пачыналася Вашае інтэрнэт-жыцьцё?**

**Хведар Караленка:** Першы сайт, які я стварыў, прысьвячаўся мультфільму «Кароль Леў». Гэта быў першы поўнамэтражны мультфільм, які я ўбачыў. Ён мяне вельмі ўразіў. Сайт мой праіснаваў год-паўтара, а потым у выніку аварыі сапсаваўся вінчэстэр з інфармацыяй.

**«НН»: Калі гэта было?**

**Х.К.:** Гэта было ў 1997-м, калі наагул сайтаў па-беларуску яшчэ не існавала. Былі толькі расейскамоўныя карпарацыйныя сайты — буйных кампаніяў, якія мелі доступ да Інтэрнэту: «БелХард», «Адкрыты кантакт» і інш. Агулам ня больш за два дзясяткі.

**«НН»: Выходзіць, што Ваш сайт пра гэты мультфільм быў першым беларускамоўным...**

**Х.К.:** Так. Прынамсі, я пра іншыя такія ня ведаю. Калі нехта мне давядзе адваротнае, я буду рады.

**«НН»: А як зьявілася «Акавіта»?**

**Х.К.:** Мне было цікава, колькі чалавек зазірае на маю віртуальную старонку. Але не было такога «лічыльніка», які б мяне задавальняў. Былі простыя сістэмы, якія толькі лічылі колькасьць наведнікаў: адзін, два, тры, чатыры, пяць... А мне гэтага было мала. Я хацеў ведаць, хто і зь якой мэтай наведвае сайт. І таму пачаў шукаць інфармацыю пра розныя сыстэмы статыстыкі. Паглядзеў, як робяцца такія сыстэмы на Захадзе. Пачаў рабіць свой «лічыльнік», а потым апублікаваў на сайце гэтую статыстыку. Людзі наведвалі, глядзелі, адзін чалавек нават даслаў ліст: добрая, маўляў, статыстыка, хачу сабе таксама паставіць такую сыстэму.

**«НН»: Чаму «Акавіта»? Так у нас за часамі Рэчы Паспалітай называлі гарэлку (ад лацінскага «aqua vita» — «жывая вада»)...**

**Х.К.:** Мне гэтае слова трапілася ў кнізе Ірыны Шкрабы «Самабытнае слова». Даваць нейкае банальнае імя кшталту «Супэрстат» дужа не хацелася.

**«НН»: «Акавіта» — гэта адзіны беларускамоўны лічыльнік?**

**Х.К.:** Так, але беларускіх лічыльнікаў наагул нямнога. «Акавіта» дае такую статыстыку, якой не паказвае аніводзін зь іх, бо яны не аналізуюць інфармацыю.

**«НН»: А якія паслугі прапануе «Акавіта»?**

**Х.К.:** Уладальнік сайту можа ўбачыць, колькі наведнікаў было ўвогуле, зь якіх яны краінаў. Ёсьць статыстыка за дзень, тыдзень, месяц; складаюцца графікі наведваньня і г.д.

**«НН»: Ці ёсьць у Вас яшчэ якія-небудзь праекты?**

**Х.К.:** Сайт, прысьвечаны «Песьнярам» (pesniary.com). На сёньняшні дзень там — самая поўная інфармацыя пра «Песьняроў». Ёсьць вельмі рэдкія запісы 70-х, зробленыя проста на канцэрце. Вядома, якасьць ня лепшая: што можна было запісаць на савецкі магнітафон і на савецкую стужку?..

Вакол сайту нават утварылася ўжо свая супольнасьць, завітваюць туды былыя «песьняры» — з Амэрыкі Анатоль Кашапараў, Валянцін Бадзьяраў зь Нямеччыны.

**«НН»: Музыка — гэта другое захапленьне?**

**Х.К.:** Так, у мяне ж музычная адукацыя. Тое, што я граю на флейце, мне прыдалося, калі я хадзіў калядаваў з гуртом Ірыны Мазюк. Я ў іх граў на дудзе, якую вельмі хутка асвоіў.

**Гутарыў Адам Воршыч**

# З Інтэрнэту — на дурня

**Што можна атрымаць у Сеціве задарма ці амаль задарма? Найперш інфармацыю. У Інтэрнэце безьліч дармавых базаў зьвестак. Архівы тэкстаў, курсы валют, расклад руху цягнікоў. Можна карыстацца энцыкляпэдыямі, «сьцягнуць» на свой кампутар патрэбную кніжку, фота, песьню, фільм, гульню.**



Яшчэ ў Сеціве процьма дармавых кампутарных праграм. Сайты кшталту www.sharewareplace.com прапануюць праграмкі, якімі можна карыстацца толькі пэўны час (30 дзён) ці запусьціць вызначаную колькасьць разоў. Пасьля праграма запатрабуе плаціць за далейшае карыстаньне ці аўтаматычна выдаліцца з кампутара. Некаторыя будуць працаваць і далей, пэрыядычна «нагадваючы» аб рэгістрацыі альбо губляючы функцыі.

Мы не парушаем закону, калі «сьцягваем» праграмы. Мы парушаем закон, толькі калі заладоўваем праграму бяз згоды ўласьніка правоў альбо працягваем яе выкарыстаньне насуперак умовам ліцэнзіі. Shareware — гэта якраз праграмы, якія можна ўсталёўваць бясплатна з пэўнымі (часавымі альбо функцыянальнымі) абмежаваньнямі; інакш кажучы — умоўна бясплатнае праграмнае забесьпячэньне. Ёсьць яшчэ freeware, цалкам бясплатнае. У Беларусі пакуль не было выпадкаў, каб судзілі за карыстаньне пірацкім прадуктам, але ж некалі прыйдзе такі час.

## Дыскі, касмэтыка і анучы

Нашто плаціць за дыскі й касэты, калі можна «закачваць» іх зьмесціва на свой кампутар задарма? У сеціве тысячы сайтаў з архівамі музычнай прадукцыі розных жанраў і напрамкаў. Самы галоўны, які павінен наведаць кожны музычны фан, — www.mp3.com. Беларускія песьні «вісяць» на knihi.com, на сайтах музыкаў, на хатніх старонках...

Можна атрымаць дармавы CD, замовіўшы яго ў Сеціве. Зайдзіце на любы шукач і напішыце: «free CD». Атрымаеце купу адрэсаў. Ад сябе прапаную: www.peoplesound.com — там шмат прыстойных запісаў. Замоўлены «дармавы» дыск прыйдзе поштай, за паслугі якой давядзецца заплаціць. А гэта дорага — пасылка ж з-за мяжы.

Зь Сеціва на вас могуць абрынуцца рэклямныя прадукты накшталт пробнікаў касмэтыкі, кашулек, плякатаў і бразготак на ключы. Тых, хто зацікавіўся, магу адаслаць на «Virtual Free Sites» (www.virtualfreesites.com) ці «My Beauty Center» (www.mybeautycenter.com). Заходзіш, выбіраеш, што жадаеш атрымаць, запаўняеш блянк, дзе запісваеш свае зьвесткі й адрас, і чакаеш.

Праўда, некаторыя фірмы, даведаўшыся, што вы жывяце ў Беларусі, а ня ў Лос-Анджэласе, нічога не дашлюць... Тут галоўнае ўпартасьць: з 25-ці анкетаў — будзьце пэўныя — нейкая непатрэбшчына абавязкова да вас дойдзе.

Якая карысьць даваць нам гэтулькі ўсяго задарма? Па-першае, мы прывучаемся наведваць пэўныя месцы ў Сеціве. Па-другое, інфармацыя пра нас трапляе ў розныя базы зьвестак. Замова дармавых прадуктаў ці паслугаў не абыходзіцца без запаўненьня «пэрсанальнай анкеты». Не зьдзіўляйцеся пасьля рэклямным лістам на свой электронны адрас. І гэта — у найлепшым выпадку. Практычна любая дармаўшчына абернецца навválaszt спаму, непатрэбнай вам бясплатнай рэклямнай рассылкі, а які халяўшчык-пачатковец вельмі проста можа нарвацца на сайт з поўным асартымэнтам апошніх вірусаў.

## Заробак у цэнтах

Можна ў Сеціве нават зарабіць, падпісаўшыся на рэклямныя электроныя дасылкі. Атрымліваеш рэгістрацыйны нумар — і чытай сабе рэкляму, запаўняй анкеты, што дасылаюцца на тваю скрыню. Але тутака трэба працаваць — звычайна плацяць некалькі цэнтаў за дзясятак прачытаных рэклямаў і запоўненых формаў. Плата за падлучэньне да Інтэрнэту зьесьць ваш «заробак». Дый грошы за прагляд рэклямы атрымаць цяжка. Здаралася, што сайты рэклямадаўцаў зачыняюцца раней, чым надыходзіць час разьлічвацца.

## Траянскія коні

Сярод шматлікіх дармавых праграмаў, што можна знайсьці ў Інтэрнэце, ёсьць і spyware, і гэтак званыя траяны, ці шпегі. Trojan — шкодная праграма замаскаваная пад карысную (як бомба замаскаваная пад электраміксэр). Spyware — код, схаваны ў некаторых праграмах, які потайкі зьбірае інфармацыю пра ваш кампутар ды адсылае камусьці.

Яны перасылаюць зьвесткі з вашага кампутара ў адмысловыя фірмы, што займаюцца стварэньнем базаў зьвестак. Праграмы-шпегі могуць падглядаць за нашымі інтарэсамі, фіксаваць час блуканьня ў Сеціве. Могуць нават дасылаць сваім гаспадарам усе тэкставыя файлы з вашага вінчэстэра. Таму, перш чым «закачаць» дармавую праграмку на свой кампутар, трэба дзесяць разоў падумаць.

Шпегаў можна знайсьці й выдаліць з дапамогай адной з наступных праграмаў: Spychecker (http://www.spychecker.com/spychecker.html), Ad-Aware (http://www.spychecker.com/adaware.html), Silencer (http://www.spychecker.com/silencer.html). Невядома толькі, ці гэтыя дармавыя ахоўныя праграмкі таксама за намі не падглядаюць.

А найлепш мець проста добрую антывірусную праграму. Яна для таго й займае кучу мэгабайтаў на дыску, каб ужо на стадыі захаваньня падазронай праграмкі напісаць што-небудзь палахлівае і выдаліць яе тут жа. А калі тая праграмка хоча сама ўсталявацца зь Сеціва — уцякайце хутчэй з таго сайту! (Праўда, часам браўзэру неабходна ўсталяваць «заплатку», альбо нейкі дадатак для карэктнай працы.) Іначай — блакітны/чорны экран, здохлая мыша, непрытомная клявіятура і адзіна магчымая кнопка «рэзэт», якую давядзецца націскаць, не ўяўляючы нават, што там запісалася на твой хардыск і чаго пры перазагрузцы ня знойдзе на ім твой кампутар.

**Руслан Равяка, АЧ**

ЯК У ІНШЫХ

# Пашпартызацыя on-line

Ужо праз тры гады палякі будуць мець магчымасьць праз Інтэрнэт падаць заяву на атрыманьне пашпарту, пасьведчаньня асобы, аформіць 70 іншых справаў. Гэты праект будзе каштаваць 100 млн. эўра ў год, аднак суадносіны затрат да эканоміі ў выніку ўкараненьня праграмы — 1:10. Укараніць сыстэму плянуецца цягам трох гадоў, аднак падатковыя разьлікі on-line для юрыдычных асоб зробяцца даступнымі ўжо пад канец гэтага году.

# Узяўся за гуж — не кажы, што ня Буш

## Расея складае анэкдоты пра вайну

**У Маскве апошні піск — анэкдоты пра вайну ў Іраку. На расейскім інтэрнэт-сайце anekdot.ru нават стварылі адпаведную тэматычную рубрыку. Нават рэспэктабэльныя «Известия» 1 красавіка надрукавалі падборку найлепшых показак.**

Ні ў палякаў, ні ў немцаў, ні ў беларусаў такога выбуху творчасьці крывавы канфлікт ня выклікаў. А ў расейцаў кожны эпізод — штурм Ум-Касру, захоп багдадзкага аэрапорту, выкарыстаньне жывёлаў для разьмінаваньня — нараджаў новыя анэкдоты. Показка застаецца ў Расеі прадуктыўным і жывым жанрам. Хоць корпус клясычных жартаў савецкага часу застаецца неперайзыдзеным.

У многіх «іракцкіх» показках замененыя толькі імёны ды геаграфія.

Які начны кашмар Буша самы страшны? Кітайцы прымаюць іслам і выпраўляюцца бараніць Ірак у якасьці шахідаў.



Ёсьць і старажытнейшыя рэчы:

Зь дзёньніка іракцкага партызана: «Панядзелак. Мы выбілі амэрыканцаў з Ум-Касру і захапілі нафтавыя вышкі. Аўторак. Амэрыканцы захапілі Ум-Каср і нафтавыя вышкі. Серада. Зьявілася служба бясьпекі «Лукойлу» і выгнала нас з амэрыканцамі ў пустэльню...

Згадваеце показку пра савецкіх партызанаў, немцаў і лесьніка? У падноўленым выглядзе яна выдатна ілюструе расейскі эканамічны інтэрас у Іраку.

На якія зоны падзеляць Ірак пасьля вайны? АІ-76, АІ-92 і АІ-95.

Часам у «настальгічных» показках адбываецца не мэханічная падстаноўка рэаліяў, але пераасэнсаваньне мінулага. Хоць бы ірана-іракцкага канфлікту, калі ЗША дапамагалі Хусэйну:

— Містэр Буш, ці маеце Вы доказы таго, што Ірак валодае зброяй масавага зьнішчэньня?
— Вядома, мы зьберагалі разьліковыя чэкі.

### Украінцы, не вылятаць!

Згадайма показку часоў савецка-аўганскае вайны: салдат з Украіны пытае з свайго акопу ў ворага: «Ти сало любиш, душмане?» — «А хто ж його не любить?!» — адказвае той. Сёлета атрымала на арэхі ўкраінская супрацьпаветраная абарона:

Пасьля таго як пачаліся вылеты Б-52 на Ірак, усе вучэньні ўкраінскіх СПА былі адкладзеныя на няпэўны тэрмін асабістым загадам прэзыдэнта Кучмы.

Хімбатальён, дасланы Кучмам у Кувэйт, расейскія жартаўнікі абсмакталі дазваньня. Але ня ўсе тыя показкі для друку. Гумару ў іх малавата, затое ксэнафобіі — звыш меры. Сапраўды, у Расеі ніяк ня могуць зьмірыцца з тым, што Беларусь і Ўкраіна — незалежныя. Таму ў анэкдотах беларусы застаюцца людзьмі не з найлепшымі інтэлектуальнымі здольнасьцямі.

Беларускія навіны: «У Насіры амэрыканскія марскія пехацінцы знайшлі склад аўтаматаў з маркіроўкай: «Зроблена не ў Беларусі». Гэта цалкам пацьвярджае пазыцыю Адміністрацыі прэзыдэнта...»

Ды аўтаматаў у Беларусі ня робяць. Прынамсі, легальна.

### Ракета зь ядрамі

Многа показак прысьвечана навінкам амэрыканскага ВПК. Прыкладам, супэрбомбе для задушэньня электроннае зброі:

З данясеньня амэрыканскай разьведкі: «Эфэкт узьдзеяньня электроннай бомбы на аўтаматы Калашнікава меншы, чым прагназавалася, бо мікрапрацэсары ў іх не выкарыстоўваюцца».

І расейскай вайсковай прамысловасьці:

Саддаму ўсё-такі ўдалося з дапамогай расейскіх навукоўцаў стварыць ядзерную ракету. Дзейнічае яна так: узьлятаючы, пачынае ўсё на сваім шляху бамбіць чыгуннымі ядрамі.

Пісьмо Хусэйна кіраўніцтву Расеі: «Дзякуй за ракеты «зямля—паветра», яны добра трапляюць у паветра. Дашліце ракеты «зямля—самалёты».

### У Багдадзе знойдзены трайнік Хусэйна!

Гэты жарт спарадзіла пільная ўвага амэрыканскіх спэцслужбаў да формы вушэй Садама пасьля выступу іракцкага лідэра па тэлебачаньні ў першы дзень вайны. Тады актывізаваліся чуткі, што сапраўдны іракцкі лідэр ці то загінуў пад бомбамі, ці то ўвогуле памёр ад раку пару гадоў таму. А перад тэлекамэрамі ды па багдадзкіх вуліцах шпацыруюць ягоныя двайнікі. Іншая показка кажа, што «Садам Хусэйн — гэта ўвогуле не імя, а воінскае званьне, таму ў Іраку ня могуць зразумець, якія менавіта Садам Хусэйн патрэбен амэрыканцам». Самы «чорны» анэкдот з усіх сустрэтых — таксама пра двайнікоў Садама.



**«Садам Хусэйн — гэта ўвогуле не імя, а воінскае званьне, таму ў Іраку ня могуць зразумець, які менавіта Садам Хусэйн патрэбен амэрыканцам».**

Зьбірае неяк двайнікоў Садама іракцкі міністар абароны і кажа: «Ёсьць дзьве навіны — добрая і дрэнная. Добрая — пасьля абстрэлу Садам застаўся жывы. Дрэнная — яму адарвала руку».

Жывучасьць Хусэйна спарадзіла «вэрсію», што сапраўднае яго імя — Дункан Маклаўд… У параўнаньні з Галівудам нават Пэнтагон адпачывае. Яшчэ трохі Галівуду:

Ангельскія салдаты на знак міралюбнасьці зьмянілі каскі на барэты. Амэрыканскае камандаваньне таксама вырашыла не адставаць. Паводле «Асашыэйтэд Прэс», у Кувэйт на амэрыканскую вайсковую базу прыбыў спэцрэйсам самалёт з 30 тыс. касьцюмамі Бэтмэна.

Дасягненьні навукі:

Навукоўцы адшукалі ген вайны з Іракам. Перадаецца па мужчынскай лініі. Прозьвішча сям'і пакуль не абвяшчаецца.

З зводкі амэрыканскага Інфармбюро: «Тактыка ўжываньня дэльфінаўсапёраў у пустэльні апраўдала сябе толькі часткова».

Лёгкі жарт з амэрыканскае прапаганды:

Праз памылку амэрыканскага пілёта была скінутая бомба з атамнай боегалоўкай на пазыцыі дывізіі брытанскіх войскаў. Як паведамляюць высокапастаўленыя асобы ў Пэнтагоне і брытанскім Міністэрстве абароны, у выніку інцыдэнту было паранена сем ваеннаслужбоўцаў Вялікай Брытаніі.

### Рамзай і зайцы

Багата якія показкі пачынаюцца словамі «як паведаміла CNN», «з зводкі амэрыканскага камандаваньня»:

Англа-амэрыканская кааліцыя паведаміла пра ўзяцьце гораду Ум-Каср. Гэта чацьверты Ум-Каср, узяты ад пачатку вайны.

А вось шпілька ў Садамаў бок:

Іракцкае тэлебачаньне паказала танкавую калёну будучых ваеннапалонных, што кіруецца да Багдаду.

Абсьмяялі й Штырліца-2003 — Рамзая.

Буш, раздражнёна: «Зьвяжыцеся з Рамзаем, атрымайце поўную інфармацыю і ўдакладніце, якія ў нас пляны на заўтра».

Хтось напісаў, пераймаючы Рамзаеву стылістыку, цэлую навэлу «Праект Мазай», у якой распавядаецца пра цяжкія баі антыкалгаснае кааліцыі ў складзе «USAстых зайцоў» і марскіх вожыкаў у раёне вёсак Ум-Касранаўка і А-Басранаўка.




От што выходзіць, калі спалучыць рэкляму пральнага парашку з тэленавінамі:

Вы ўсё яшчэ ня ведаеце, што такое дэмакратыя? Тады мы ляцім да вас!

Фоткі Буша, аздобленыя гэтым надпісам, імгненна разьляцеліся ў Інтэрнэце. Адну паказалі нават у навінах АНТ.

У шматлікіх показках пра Буша гумар як такі часьцяком адсутнічае. Ягоны вобраз не параўнаць з Рэйганам савецкіх показак. Той амаль заўсёды «працаваў у пары» з генсекам СССР — і невядома яшчэ, хто быў горшы.

Зрэдку ў анэкдотах зьяўляецца Пуцін.

Набліжаюцца прэзыдэнцкія выбары ў ЗША. Вайна ў Іраку зацягнулася, Садама не злавілі. Буш вырашыў мірыцца з Пуціным. Сустракаюцца. Буш: «Уладзімер, як Вы ўсё-такі здолелі прыструніць тых тэрарыстаў з Чачэніі?» Пуцін: «Паабяцаў іх мачыць у сарціры». Назаўтра Буш папрасіў зьмясьціць выявы Хусэйна і бэн Ладэна на пісуар у прыбіральні Белага Дому.

У кожным жарце ёсьць доля жарту. Большасьць жартаў — адкрыта антыамэрыканскія. Анэкдоты, расчыненыя на фобіях і комплексах, як разьведзеная ў вадзе таблетка салодкае нянавісьці, дапамагаюць людзям забыцца на свае надзённыя праблемы. Ці то яны чысты прадукт прапаганды расейскіх СМІ, ці то частка гэтае прапаганды? Невядома, наколькі да стварэньня пляскатых «канвэерных» показак пра Ірак, якімі загружаны расейскі Інэт, прыклалі руку спэцслужбы. У савецкі час яны такое рабілі. Тэхналёгіі захаваліся. Але ня ўсе показкі «замоўленыя». Трапляюцца, як любяць пісаць фальклярысты, і сапраўдныя дыямэнты самаіроніі:

У высакагорным чачэнскім ауле джыгіт кажа расейскаму рабу: «У мяне сёньня сын нарадзіўся. Скажы, пра што марыш, — зраблю». Раб падумаў і кажа: «Хачу, каб амэрыкосаў паперлі з Іраку!»

**Сяргей Мікулевіч**

**Падведзеныя вынікі традыцыйнага літаратурнага конкурсу для школьнікаў «Я маю твор...», што ладзіцца ў рамках акцыі «Дзень Зямлі». У конкурсе ўзялі ўдзел больш за дзьве тысячы аўтараў. Дваццаць фіналістаў будуць запрошаныя ў Менск, дзе 25—27 красавіка адбудуцца майстар-клясы, выступы й узнагароджваньне пераможцаў. Зьмяшчаем тут вершы фіналістаў-паэтаў.**

**Андрэй Хадановіч**

## Аляксандра ПАПКОВА

* * *

Вы ціхенька прайшлі па маім непрыкметным жыцьці,
Як праходзіць ураньні ад цёмнае ночы трывога.
Бессэнсоўна кранаю зямлю — і іду ў забыцьці,
Мне бясконцай і цьвёрдай цяпер падаецца дарога.

Зьніклі Вы, адчыніўшы звычайную сутнасьць зямлі
І надаўшы сугучнасьць асеньнім самотным імгненьням.
Рэчаіснасьць — цяжар для мяне. Я згараю ў агні
Разам з мрояй сваёй, разам з смагаю вечных імкненьняў.

Вы пакінулі ўсё... Вашы крокі закрэсьлілі іншыя дні.
У душы прыкры змрок, безвыходная сутнасьць пытаньняў.
Мне б яшчэ раз пабачыць глыбокіх празрыстых вачэй прамяні.
У сьвядомасьці боль ад халодных, маркотных расстаньняў...

Вы ціхенька прайшлі па маім непрыкметным жыцьці,
Вы герой для мяне. Вас чакае паўсюль перамога.
Бессэнсоўна кранаю зямлю — і іду ў забыцьці.
Закаханая ў Вас, я маўкліва імкнуся да Бога.

Ліда


АЛЕНА АДАМЧЫК

## Вольга АНІКІЕВІЧ

### Дождж вясновы

Дождж заблішчаў мокрым асфальтам,
дарожкамі,
замутнеў бруднай вадою ў лужынках.
Гэта ён, нібы дзіця з пухлымі ножкамі,
ходзіць па сьвеце, над зямлёю кружыцца.

Ён размаўляе з дрэвамі і з палямі,
ён баіць ім казкі хмарныя.
Гэты дождж, які доўга зьвініць начамі,
нашыя справы сур'ёзныя робіць марнымі.

Гэта ён змывае ўсе брудныя думкі,
асьвятляе патроху зямлю і неба;
я чамусьці шукаю ў дажджы паратунку.
Мо таму, што ён мне пахне хлебам?..

Лужасна, Віцебшчына

## Марыя ВАЛЫНЕЦ

* * *

Пазаві ты мяне напрадвесьні,
Жаўруковаю песьняй змані,
Каб пачуцьці зноў уваскрэсьлі,
Каб вярнуцца ў лепшыя дні.

Пазаві ты мяне ў лета,
Сьпелым коласам паказычы,
На палянах сунічных, сьветлых
Пра каханьне сваё нашапчы.

Пазаві ты мяне ў восень,
У спатканьні бяссонных начэй,
Дзе ў калматых аблоках просінь
Сьвеціць зьнічкамі любых вачэй.

Пазаві ты мяне ў зімні
Дзень, што зь лёгкім марозцам прыйшоў.
Стане гукам любага імені
Звон апалых са стрэх ледзяшоў.

Пазаві ты мяне ў жнівень,
У знаёмства салодкі міг,
Дзе сьцяжынка між намі дваімі
Стала сьцежкаю на дваіх...

Вялейка

## Алена ШМЫК

### Глушэц

Глушэц каменьчыкі глытае,
Глушца вясной жаўрук пытае:
— Скажы, ці шмат ад іх карысьці?
Шукаў бы чарвякоў у лісьці!

Глушэц матляе галавою:
— Люблю пупышкі я і хвою,
А як дабаўлю галькі сьвежай,
Дык лепш засвойваецца ежа!

Глушца жаўрук ўшчувае строга:
— І ўсё ж ня еў бы ты іх многа!
Бо ад цяжару, што глытаеш,
Занадта нізка ты лятаеш!

### Ноты

У музычнай школе
Зайчык дзень прабыў.
— До, рэ, мі, фа, соль, ля! —
Ноты ён вучыў.
Потым ля загону
Рваў стручкі за трох
І сьпяваў натхнёна:
— До, рэ, мі... гарох!

Заберазь, Івейшчына

## Цемрык ВЕЛЕТ

* * *

Калі разумееш, што папера —
таксама прастора,
адчуваеш сябе халерна
нэрвова.

Менск

## Уладзімер ЛЯНКЕВІЧ

### Страляць

Мой горад такі прыгожы,
Што хочацца скокнуць на яго,
Пацалаваць атручаны асфальт,
Расьцекчыся па вуліцах,
Потым вярнуцца назад
І напісаць аб пачуцьцях...

Але за акном
Толькі малюнкі
Злоснай рукі,
Таму няма сэнсу...

Скакаць на паперу —
Што скакаць на дрэвы,
Страляць у сяброў —
Што страляць у сябе...

Менск

## Ала НАВАГРОДЗКАЯ

### Патрыётка

Багдановіч, Колас і Купала,
Караткевіч, Куляшоў і Цётка...
Прачытала, ўсё асэнсавала
І сказала: «Буду патрыёткай!»

У душы маёй агонь гарыць,
І ня буду я зважаць на моды.
Я па-беларуску буду гаварыць
Кожны дзень, усюды і заўсёды!

— Я хачу купіць вось гэту рэч...
Прадавец мне дзіўна пасьміхаецца:
— Чтобы говорить, нужна нам речь,
Она не продается и не покупается.

— Ці ж Вам, даросламу, ня сорамна маніць?
І як Вы мне хлусіць у вочы можаце?!
— Вы что!.. Притягивать?.. Манить?..
Зачем по пустякам меня тревожите?

— Скажу я Вам, працуеце Вы блага!
І прадаўцом Вы быць ня здольны!
— Конечно, делаем мы всё во благо,
И покупатели у нас довольны!

— Усё! Скажэце Ваша прозьвішча!
На Вас хачу я скаргу напісаць!
— Нет клички у меня, нет прозвища...
Не знаю, что еще сказать...

Багдановіч, Колас і Купала,
Караткевіч, Куляшоў і Цётка...
Прачытала, ўсё асэнсавала:
Я ўсё роўна буду патрыёткай!

Ліда

## Віялета ПАЧКОЎСКАЯ

* * *

Зіма ня золата, і сьнег не павуціна,
А я гляджу ў акно, чакаю — раптам зь неба,
Танцуючы з імпэтам тарантэлу,
Ўпадзе між белых кветак жоўты ліст.
Няма. Зіма. Ізноў прыйшла зіма!
А я яшчэ не далюбіла восень,
Не дапісала вершаў ёй на мокрым лісьці...
Не разьвітаўшыся, пайшла...
Зіма... Ня восень,
І золата ніяк ня стане срэбрам,
А срэбра — золатам... Як ні чакай таго, ніяк!
Зіма... Сьнег — белы, злы, халодны, цьвёрды...
Мы ж з восеньню удзьвюх паплачам вадкім.
Пардон, цяпер адна...
Адна.
Зіма.

Кастрыца, Барысаўшчына

## Алена ПЯТРОВІЧ

* * *

Празь сіні дым,
Праз сотні вымярэньняў,
Празь цёмны цень пакінутых дарог,
Праз згаслы дзень у чорных сутарэньнях,
Праз страх, што зноў прыходзіць на парог,
Праз страчаныя ветразі надзеі,
Праз брудны сьнег, жабрацкую вясну,
Праз здраду,
Праз балючыя падзеньні,
Праз крах ілюзій, заканчэньне сну,
Празь мірыяды твараў палахлівых,
Што хочуць уступіць у небыцьцё,
Нам усьміхацца будзе сарамліва
Ўсяўладнае, бяздоннае жыцьцё.

Віцебск

## Руслан САЛАВЯНЧЫК

### Салавейка

На радзіму прыедзь, дзе лясы не заснулі —
І шумяць, і пяюць і вясной, і зімой.
Цябе зь цёплай усьмешкай сустрэнуць бабулі,
Скажа кожная зь іх: «Салавейка ты мой...»
Хай ня ставіў ты зь імі смалістыя зрубы,
На сяўбе і жніве не хадзіў талакой,
Зь імі хлеб ты ня пёк, але добрыя губы
Сьветла кажуць табе: «Салавейка ты мой...»
Як лясныя пажары, ішлі чужаніцы.
Кожны колас у полі абмыўся крывёй,
Ды плыло і ў барох, і ў блакітных крыніцах,
Нібы сонца прамень: «Салавейка ты мой...»
Мой народ не пампэ, у вякох не растане,
Мой народ будзе крочыць хадой маладой,
І пакланіцца хлебу, як сонейка ўраньні,
І сустрэне сыноў: «Салавейка ты мой...»

Случчына


УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

ПРАЎДА!

# Лукашэнка спаліў школу

Гэта адбылося ў ноч з 5 на 6 красавіка ў вёсцы Хутар Сьветлагорскага раёну. На шчасьце, пажар ня меў такіх жахлівых наступстваў, як у Якуціі ды Махачкале. Агонь выпаліў толькі першы паверх двухпавярховай будыніны, далей яму распаўсюдзіцца не далі.

Пажар учыніў жыхар гэтае вёскі Аляксандар Лукашэнка. Раней ужо судзімы за зладзейства, ён праз пабітае акно ўлез у сталоўку, скраў вядро павідла ды вядро згушчанага малака. Кампутарную клясу злачынца адчыніць ня змог. А пажар узьнік таму, што злодзей сьвяціў сабе, запальваючы шматкі паперы.

Цяпер настаўнікі і вучні Хутарскай сярэдняй школы рыхтуюць яе да рамонту.

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

ЖАРТ

**Ч**эсны **А**хотнік **Ж**элает **З**ашчыціць **Б**едных **С**ідзячых **Ф**азанау.

**АР**

З КАМПЭТЭНТНЫХ КРЫНІЦ

Адзін знаёмы міністэрскі чын паўшэптам распавёў у калідоры: «Прыслалі запрашэньне на сход інтэлігенцыі. Ведаю я гэтыя сходы: на аднаго інтэлігента — два кадэбісты. Потым зацягаюць. Адпісаў сакратарцы «В дело»».

**В.В-к, Менск**

ЦЫТАТА

# У здаровым нутры — здаровы сэнс

Калі раней выкладаньне эканомікі было вольным, дык цяпер некаторыя пачнуць азірацца... Аднак я спадзяюся на здаровы сэнс і здаровае нутро нашых прафэсараў.

**Станіслаў Багданкевіч, naviny.by**



## Выстава Міхася Басалыгі

**У сьветлагорскай карціннай галерэі «Традыцыя» адкрылася пэрсанальная выстава графічных работ Міхася Басалыгі.** Найперш гэта партрэты знакамітых гістарычных асобаў. З палотнаў глядзяць Рагнеда і Скарына, Ягайла і Вітаўт, Эўфрасіньня Полацкая, Леў Сапега, слуцкія Алелькавічы. Другую частку выстаўленых твораў складаюць батальныя палотны: «Бітва на Нямізе», «Бітва пад Грунвальдам», «Бітва пад Воршай»... Прадстаўлены таксама графічныя ілюстрацыі да паэмы Янкі Купалы «Курган». Асобна варта адзначыць карціну «Трагедыя Сафіі Полацкай». На палатне — ашалелы ад гарэлкі расейскі цар Пётра I з сваёй хеўрай сячэ шаблямі сьвятароў у храме Сьвятой Сафіі.

Дарэчы, адзінаццаць гадоў таму галерэя «Традыцыя» адкрывалася пэрсанальнай выставай Аляксея Марачкіна.

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

«НН» дзякуе за падтрымку Міхасю Лужынскаму з Сыднэю (Аўстралія).

## Перад Радаўніцай

**19 красавіка адбудзецца прыбіраньне старажытных менскіх могілак XVII ст.,** якія знаходзяцца побач з былым загарадным домам Ваньковічаў, што між мэтро «Маскоўская» і аўтавакзалам «Маскоўскі». Падчас другой сусьветнай вайны на тых могілках таемна хавалі забітых. Цяпер каля іх месьціцца абсэрваторыя. Узяць удзел у прыбіраньні, а таксама паслухаць гістарычную лекцыю Вы зможаце пачынаючы ад 13-й. З сабою мець пальчаткі.

У Віцебску ў гэты дзень будуць прыбіраць Старасямёнаўскія могілкі. У Пінску 21 красавіка зробяць парадак вакол Прыдарожнае капліцы XVIII ст., якая пакуль не стаіць на ўліку як помнік архітэктуры. Случчакі зьбіраюцца 20-га прыбраць пахаваньні Альгерда Абуховіча, Яўгена Гучка і іншых беларускіх дзеячоў на мясцовых могілках. Дадатковую інфармацыю пра гэтыя акцыі можна атрымаць па т. (8-029) 663-29-51 (Ірына).

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У артыкуле «Трагедыя ў фантастычных апавяданьнях («НН» №14) замест «Генадзь Давыдзька» трэба чытаць «Генадзь Аўсянікаў».

КОНКУРС «НН»

**Ч**аму **А**брала/**П**расіла **Ж**аўнера **З**нахарка **Б**іць **С**карабеяў **Ф**уфайкай?

**Ч**ыжык **П**рынёс/**А**днёс **Ж**аўруку **З**а **Б**алота **С**мачны **Ф**ізаліс.

**Вольф Рубінчык, Менск**

**Ч**овен, **П**оўны **Ж**абак, **З**ноўку **Б**усел **С**урыкам **Ф**арбуе.

**Ч**ародка **П**ярэстых/**А**дчайных **Ж**урботных **З**язюляў **Б**аялася **С**умнага **Ф**іліна.

**Ч**апяла **П**атэльню **Ж**алезную **З**ьвярнула! **Б**арджджэй **С**ьцялі **Ф**артух!

**Андрэй, Таня, Ульляна ды Ганна Коржычы, Гомель**

**Č**amu **A**dčajvajecca (**P**ieražyvaje) **Ž**ak? **Z**abrudziŭ **B**o **Ś**viatočny **F**rak.

**Karcavy, Miensk**

**Ч**арцяка **А**б'явіўся/**П**рыкідаўся **Ж**аніхом, **З**авабіў **Б**абу **С**інім **Ф**артухом.

**Антон Бубала, Верхнядзьвінск**

**Ч**аму **П**авінна/**А**бавязана **Ж**ыгучкі **З**убраня **Б**аяцца **С**ярод **Ф**іялак?

**Зьміцер Дыхт, Віцебск**

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Генадзю Л., В.С. зь Менску.** Праблемы гэтыя нежыцьцёвыя. Больш жыцьця, хлопцы!

**Юр'ю К. з Воршы.** Многа пішаце пра тое, што жыць цяжка. А каму калі было лёгка? Вашы справы абвяргаюць Вашы словы. Вы знаны чалавек, жывяце так актыўна, што ніхто не паверыць пэсымістычнаму падтэксту Вашага допісу.

**Аляксандру М. зь Віцебску.** Ваш экскурс у гісторыю грошай не газэтны. Прапануйце яго якому гістарычнаму часопісу. Пераконваць чытачоў «НН» у нявыгаднасьці для Беларусі «адзінага рубля» з Расеяй — лішняе.

**Уладзімеру Я. з Маладэчна.** Ваш ліст перадамо Радзе Сходу інтэлігенцыі.

**Сержуку Ваяру зь Менску.** Не бяды, што не ўдаюцца вершы. Пастаўце сябе ў сытуацыю Кушаля, побач зь якім пісала Арсеньнева.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Бугаёў Дз. Максім Гарэцкі**. — 2-е выд., выпраўлен., дап. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 239 с.

Першы раз гэтая кніга пабачыла сьвет яшчэ ў 1968 г. і на той час была адзіным манаграфічным нарысам, у якім разглядаўся творчы даробак «крамольнага» аўтара. Перавыданьне дапоўненае разьдзелам «Аплачана жыцьцём», дзе аналізуюцца творы М.Гарэцкага, замоўчаныя ў 60-я. Цана кнігі — каля 1500 руб.

**Падокшын С. Беларуская думка ў кантэксьце гісторыі й культуры.** — Менск: Беларуская навука, 2003. — 316 с.

У выданьне ўвайшлі артыкулы, прысьвечаныя беларускай філязофскай, грамадзка-палітычнай і прававой думцы XI—XVII ст. Асноўная ўвага зьвернутая на пэрыяд Адраджэньня ды Рэфармацыі. Цана выданьня — блізу 3600 руб.

**Пётра Сергіевіч. 1900—1984 г.: З прыватных калекцыяў у Польшчы:** Каталёг / Беларускае культурнае таварыства «Хатка»; Беларускае гістарычнае таварыства; Рэд. А.Глагоўская. — Беласток.

У каляровым альбоме — 116 твораў Пётры Сергіевіча, адшуканых рэдактаркай у прыватных зборах Польшчы. Тэкст — на беларускай, польскай, літоўскай і ангельскай мовах.

**Славянскі сьвет: Крыніца:** Літ.-мастац. і грам.-паліт. часопіс. — 2003. — № 2.

**Березак Василий. Афганский смерч: Очерк неоконченной войны**. — Наваполацак, 2002. — 54 с.

Нарыс у дынамічным, напружаным стылі раскрывае гістарычныя ды ідэалягічныя асаблівасьці аўганскай вайны 1979—1989 г., якая, з пункту гледжаньня аўтара, мела характар «савецкага Віетнаму». Кніга й зьмешчаныя ў ёй здымкі могуць выклікаць шок.

**Великие мыслители XX века** / Аўт.-укл. Аліса Логрус. — Масква: Марцін, 2002. — 512 с.: іл.

У падрыхтоўцы выданьня ўдзел бралі М.Баярын ды А.Баршчэўская. Складальнікі паставілі за мэту не абмяжоўвацца сьветам заходняга мысьленьня. Таму ў кнізе побач з імёнамі А.Арто, Р.Барта, Х.Л.Борхеса, З.Фройда, М.Фуко прадстаўленыя постаці буйных інтэлектуалаў Расеі, Індыі, Кітаю, Лацінскай Амэрыкі. Сярод знакамітых мысьляроў XX ст. беларус толькі адзін — Ігнат Абдзіраловіч, аўтар «Адвечнага шляху».

**Лидер.** — 2003. — № 4.

Большасьць артыкулаў мае выразную практычную скіраванасьць, аналітычныя матэрыялы падаюцца ў прывабнай папулярнай форме. Нумар знаёміць з пэрспэктывамі дзейнасьці адзінай пакуль у Менску рэстарацыі, дзе можна пакаштаваць стравы беларускае кухні, — страўні «Tałaka», што на Ракаўскай.

**Книжный бизнес Беларуси 2003.** Справ./Сост В.Ресенчук. — Менск, 2003. — 320 с. Наклад 500 ас.

Даведнік пра кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюднікаў, Кніжную палату, паліграфістаў, вытворцаў ды пастаўшчыкоў паліграфічнага абсталяваньня.

**Тацяна Вабішчэвіч**

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАЦА**

**Француская мова**: пераклады, кантрольныя працы, кансультацыі. Т.: (8-029) 752-38-33

**Польская мова**: пераклады, кансультацыі, запаўненьне анкетаў, CV, рэкамэндацыі. Т.: (029) 750-67-95

**Праца для студэнтак**. 2 разы на тыдзень у вольны час. Т.: 285-00-00, аб.14736. Таіса

**Праца для жанчын**. 2 разы на тыдзень. Бясплатнае навучаньне. Т.: 207-00-00, аб.20819

**ВІТАНЬНІ**

**Віншую ўсіх**, хто служыў у войсках СПА! Алег

**Натальлю Фурс** шчыра віншуюць з Днём нараджэньня муж і дзеці. Мы цябе моцна любім!

**Віншую Беларусаў** зь Вялікаднем! Хлеба і віна для вашага стала! Рыгоравіч

**Віншую Беларусаў** з галоўным сьвятам! Хрыстос уваскрос! Сапраўды ўваскрос! Уніят

**Вітаю Беларусаў** у дзень сьвяты! Хрыстос уваскрэс! Маліцеся па-беларуску! Грамадзянін БНР

**Валянцін!** Прывітаньне з «Купалінкі» з-пад Менску! Натальля

**КАНТАКТЫ**

**Вельмі хачу** прачытаць кнігі «Беларуская нацыянальная ідэя» і «Дарога праз Курапаты». Можа, хто дапаможа? А/с 714, 22120, Барысаў-1, Алег

**Цікава**, а як зваць сп.Булгакава? Бачыў 3 варыянты: Валер, Валеры, Валерка. Адкажыце, калі ласка

**У Купалаўскім** сквэры 20 і 27 красавіка а 13-й адбудуцца літаратурныя чытаньні. Запрашаем усіх прыхільнікаў беларускага слова.

**Увага!** Месца збору менскага Маладога фронту зьмянілася. Тэлефоны для даведак: 239-65-26 (Павал, Аляксей), 232-54-58 (Зьміцер)

**Ці дзейнічае** яшчэ Gega Ruch? Калі так, што ў вас новага? Чаму не адказваеце на лісты? Алег

**Усіх сумленных** асобаў заклікаю да паспалітага складаньня «Чорнае кнігі злачынстваў схізмы (праваслаўя)». Зьвесткі прымаю друкаваныя і лічбавыя. Т.: 247-13-40. Запрасеце пана Скіргайлу

**Юр'ю Хадыку** мойная здромавая салідарнасьць! Анутыкі ворагам Слушнасьці, якія не ўхваляюць Сьвятарнай Вайны, — ганьба да жалю! Pan Skirhajła Palanecki-Mackievič

**Чалавецтву вядомыя** сем цудаў свету, створаныя рознымі народамі ў розныя часы. Прапануем Вам назваць сем фэнамэнальных помнікаў, падзеяў, асоб і г.д., якія вылучаюць наш народ у сусьветнай супольнасьці. Дасьледаваньне ладзіць катэдра этналёгіі й фальклярыстыкі факультэту народнай культуры БДПУ імя Максіма Танка. Дасылайце свае адказы ў кароткай ці пашыранай форме (пажадана з кантактным тэлефонам) да 1 траўня 2003 г. на адрас: вул. Громава, 38—21, 220051, Менск. Т.: 274-04-72. Алеся Лозка

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Новую кнігу** Марыі Вайцяшонак «Сад нявіннасьці» можна пабачыць на Ўправе БНФ (вул.Варвашэні, 8) і набыць у кнігарні «Падпісныя выданьні»(пр.Скарыны, 14)

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»

**OLSA.by.ru** — навіны беларускага мэдывалю, апошнія канцэрты, новыя фота

**Кнігі — поштай — новае:** мультфільмы Ўолта Дыснэя па-беларуску (14 найменьняў), новыя кнігі (6 найменьняў). Замаўляйце каталёг: праз пошту — а/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: (8-029) 643-57-33.

**Беларуская музыка** ў Магілёве. Т.: 26-24-42

**«Стары Ольса»** будзе граць на «Рок-каранацыі», якая адбудзецца 25 красавіка ў КЗ «Менск» (прысьвечаная памяці Мулявіна)

**Часопісы** «Роднае слова» за 1996—2001 г. прадам. 35 у.а. Т.: 270-45-64

**Прыватная калекцыя** экстрэмальнай музыкі чакае новых уладальнікаў. Ад Вас — капэрта са зв/а, Вам — каталёг. А/с 31, Пінск-1, 225710

**Радаводы** беларуска-літоўскіх князёў з календаром на 2003 г. Каляровы, фармат 35х40 см. Прадаюцца. Т.: 251-30-15 (вечар)

**НАБУДУ**

**Калькулятары** «Электроніка» ў добрым стане. Т.: 201-60-57

**Рэлізы** Dork Ambient/Neofolk etc. фармацый (CMI, AORTA, TESCO etc.). Часовы абмен магчымы. А/с 31, 225710, Пінск-1. E-mail: mmaximus@tut.by

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3706.

Нумар падпісаны ў друк 16.04.2003.

Замова № 2067.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а